ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 45 (2098)
3 чэрвеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДА ФЕСТЫВАЛЮ САМАДЗЕЙНАГА МАСТАЦТВА

Адбылося пасяджэнне аргкамітэта па правядзенню Рэспубліканскага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Разгледжаны пытанні аб парадку і тэрмінах правядзення фестывалю, заслуханы паведамленні творчых саюзаў — кампазітараў, мастакоў, работнікаў кінематаграфіі, а таксама Камітэта па друку, Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанні, Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР аб іх удзеле ў падрыхтоўцы да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва.

Цяпер у рэспубліцы праходзіць першы тур фестывалю. На фабрыках, заводах, будоўлях, у навучальных установах, калгасах і саўгасах адбываюцца творчыя справаздачы самадзейных калектываў па ўсіх жанрах мастацтва. Спевакі, танцоры, музыканты, аматары драматычнага мастацтва і чытальнікі трымаюць экзамен на права ўдзелу ў раённых аглядах.

У лютым — сакавіку 1967 года будзе праходзіць другі тур Фестывалю самадзейнага мастацтва рэспублікі. Пераможцы раённых і гарадскіх аглядаў выступяць у абласных цэнтрах і ў горадзе Мінску.

Трэці тур маецца на ўвазе правесці з сакавіка па ліпень 1967 года. У гэты час у Мінску адбудзецца агляд лепшых самадзейных тэатральных калектываў, пройдуць справаздачныя канцэрты абласцей, агляд аматарскіх кінафільмаў, дэкада мастацкай самадзейнасці школьнікаў. Будуць адкрыты выстаўкі самадзейнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзіцячага выяўленчага мастацтва і тэхнічнай творчасці.

ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ КІНАФІЛЬМАМ

Дзесяць дзён у сталіцы Украіны праходзіў Усесаюзны кінафестываль.

Падведзены вынікі агляду.

Першая прэмія па раздзелу сучаснай тэматыкі прысуджана мастацкаму шырокаэкраннаму фільму «Ніхто не хацеў паміраць» Літоўскай кінастудыі. Другой прэміі ўдастоена кінакарціна «Старшыня».

Першая прэмія за лепшы гісторыка-рэвалюцыйны фільм прысуджана кінакарціне «Ленін у Польшчы» («Масфільм»). Другую прэмію атрымалі два фільмы: «Рашаючы крок» («Туркменфільм») і «Зорка Улугбека» («Узбекфільм»).

Спецыяльная прэміяй журы за мастацкі пошук і наватарства адзначана карціна Кіеўскай кінастудыі імя А. Даўжэнкі «Цені забытых продкаў».

Прэмію за лепшы дзіцячы фільм падзялілі кінакарціны «Марозка» (студыя імя Горкага) і «Горад майстроў» («Беларусьфільм»). Сярод мультфільмаў лепшым прызнаны «Канікулы Баніфацыя».

Прысуджаны таксама прызы за лепшыя мужчынскія і жаночыя ролі. Журы па хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмах прысудзіла спецыяльны прыз М. Рому за фільм «Звычайны фашызм». Па раздзелу хранікальна-дакументальных карцін першая прэмія прысуджана двум фільмам: «Караблі не паміраюць» і «Кацюша». Сярод навукова-папулярных фільмаў першую прэмію таксама падзялілі дзве карціны: «На мяжы жыцця» і «Чалавек і атам».

У Палацы спорту адбылося вялікае свята кіно, на якім былі ўручаны прызы і дыпломы Усесаюзнага кінафестывалю.

МЫ — ТРАКТАРАЗАВОДЦЫ

Сталявар Уладзімір Цімафеевіч Сачыўка — ветэран завода.

Неяк я стаяў ля прахадной нашага завода, калі скончылася змена. Валам ішлі рабочыя. І раптам падумалася — многа ж моладзі ў нас працуе. Вось і цяпер ідуць два хлопцы. Ажыўлена размаўляюць, размахваюць рукамі:

— Дык я кажу майстру — колькасць абаротаў можна павялічыць, а ён мне...

Ясна, сваімі думкамі гэтыя хлопцы там, у цэху. Яшчэ раз паглядзеў на іх. Абодва бялявыя, віхрастыя, у камбінезонах. Абодвум гадоў па дваццаць.

Дваццаць... Столькі, колькі нашаму трактарнаму. Для хлопцаў завод — ого, які стары. Гэта ж цэлых дваццаць год!

Ну, а для гэтага сівога рабочага, што павольнай хадою выходзіць з прахадной — для яго гэтыя дваццаць год вялікі тэрмін? Мусіць, не. Мусіць, ён бы сказаў: «Ды гэта ж толькі ўчора было. Толькі ўчора...»

Так, для яго толькі ўчора былі палаткі будаўнікоў на ўсходняй ускраіне Мінска, толькі ўчора былі павалены першыя сосны на месцы будучага завода...

Будучага... Кажуць, чалавечая фантазія не мае межаў. І ўсё-такі людзям, што прыйшлі сюды ў сорак шостым, цяжка было ўявіць тое, што стала тут праз дваццаць год.

Кажуць, што лічбы — сумная рэч. Але лічбы, якія я цяпер назаву, прыемна слухаць не толькі кожнаму трактаразаводцу, а і кожнаму беларусу, бо трактарны завод — гонар і слава рэспублікі.

Значыць — лічбы. За першыя адзінаццаць год завод выпусціў 100 тысяч трактараў. Каб падвоіць гэтую лічбу, спатрэбілася яшчэ тры гады. Сёння на рахунку трактаразаводцаў ужо 485 тысяч машын. А ў наступныя пяць год з брамы завода выйдзе яшчэ столькі...

Памятаеце словы Ільіча на VIII з'ездзе партыі ў 1919 годзе? «Калі б мы маглі даць заўтра 100 тысяч першакласных трактараў, забяспечыць іх бензінам, забяспечыць іх машыністамі (вы вельмі добра ведаеце, што пакуль гэта — фантазія), то сярэдні селянін сказаў бы: «Я за камунію» (г. зн. за камунізм)».

Каб мог наш правадыр цяпер паглядзець на сотні і сотні тысяч трактараў на палях нашай Радзімы...

...Зірніце на фотаздымак, на якім два цёмнаскурыя юнакі ўважліва слухаюць старога рабочага.

У віхры танца — салісты ансамбля «Лявоніха» Алег Грыгор'еў і Валянціна Мыцько.

Гэтыя хлопцы — кубінцы Серхіо Бскана і Лазара Гарсія. Не падумайце, што яны на сваёй радзіме не бачылі нашага беларускага трактара. Колькі хочаш. Нашы сталёвыя коні працуюць на палях Кубы і яшчэ ў пяцідзесяці краінах свету. Так што для хлопцаў такі трактар — не навіна. Прыехалі ж яны да нас вучыцца, каб стаць кваліфікаванымі майстрамі.

Я гляджу на іх і думаю — што такое завод? Скажуць: во, дзівак, якое пытанне задае. Дзіця і тое ведае: завод — гэта, дзе выпускаюць машыны.

Відаць, гэта было правільна раней. Цяпер не. Ва ўсякім разе, для Мінскага трактарнага. Таму што наш трактарны выпускае не толькі машыны — ён вялікая школа, вялікая кузня кадраў. Гучна сказана? Дык вось вам яшчэ адна лічба. За дваццаць год 100 тысяч чалавек павысілі тут кваліфікацыю.

Памятаеце двух хлопцаў, пра якіх я расказаў у пачатку? Ішоў я дадому і думаў — скончылася змена, як, цікава, яны правядуць рэшту дня?

Мо яны вучацца ў заводскім машынабудаўнічым тэхнікуме? Тады хлопцы дома хуценька прывядуць сябе ў парадак, за кніжкі і айда на заняткі. Тэхнікум наш карыстаецца добраю славай. Ён выпусціў ужо больш 1500 спецыялістаў, якія сёння працуюць на заводзе. Ну, а можа хлопцы сёння яшчэ не студэнты. Тады планы на вечар у іх іншыя. Пойдуць, напрыклад, у заводскі Палац культуры. Тут кожны можа знайсці сабе занятак да спадобы. Ёсць у цябе схільнасць да жывапісу, да скульптуры? Калі ласка, ідзі займацца ў студыю выяўленчага мастацтва. Ёсць у цябе здольнасці да музыкі, любіш добрую песню, танец — цябе з радасцю прымуць у калектыў мастацкай самадзейнасці. Самадзейныя артысты завода славяцца на ўсю рэспубліку. Нават на ўсю краіну. Народны ансамбль танца «Лявоніха» — лаўрэат Усесаюзнага конкурсу мастацкай самадзейнасці, дыпламант Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. Талентам ансамбля захапляліся жыхары Масквы, Рыгі, Волгаграда, Вільнюса, Варшавы...

З заводскага двара — ва ўсе канцы свету.

Ідзе пасяджэнне літаратурнага аб'яднання.

А драмкалектыў, які вырас у народны тэатр і спектаклі якога ўражваюць сапраўдным прафесіянальным узроўнем!

А можа мае хлопцы пішуць вершы ці спрабуюць свае сілы ў апавяданні. І сёння вечарам яны пойдуць на пасяджэнне літаратурнага аб'яднання, якое працуе пры рэдакцыі заводскай шматтыражкі «Трактор»...

...Прачытаў усё, што напісаў. Здаецца, многа атрымалася. І тут жа злавіў сябе на думцы: не, яшчэ вельмі пра многае не сказаў: і пра выдатных людзей, і пра новае абсталяванне, і пра шматлікія замежныя дэлегацыі, што едуць да нас вучыцца, і яшчэ, і яшчэ...

Але пра ўсё не раскажаш у адным артыкуле. Пра ўсё, што зроблена за дваццаць гадоў людзьмі, якія носяць гордае імя — трактаразаводцы.

І. СТРАЛЬЦОЎ,
метадыст Палаца культуры Мінскага трактарнага завода.

Фота С. АНАНКІ.

Хлопцы з далёкай Кубы прыехалі вучыцца на Мінскі трактарны.

НА ПАРАДКУ ДНЯ — КУЛЬТУРА І БЫТ ВЁСКІ

«Аб мерах па паляпшэнню жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў сельскай мясцовасці» — такім было асноўнае пытанне, якое стаяла на чарговай пятай сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

У дакладзе намесніка старшыні аблвыканкома А. Іволчына было прыведзена шмат цікавых лічбаў. За апошнія пяць гадоў у вобласці пабудавана і рэканструявана больш 200 клубаў, 553 школы, 19 аптэк, 48 дзіцячых садоў і яслей, 17 бальніц, значна павялічылася сетка прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, больш за 90 процантаў усіх сельскіх двароў радыёфікавана і электрыфікавана.

Сесія адзначыла, што некаторыя райвыканкомы не аддаюць належнай увагі будаўніцтву клубаў, часам доўгатэрміновыя дзяржаўныя крэдыты не выкарыстоўваюцца. Марудна будуюцца не толькі клубы — сур'ёзныя ўпушчэнні ёсць і ў будаўніцтве лазняў і бальніц, прадпрыемстваў грамадскага харчавання і гандлю.

Аб прычынах, якія тармозяць развіццё жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва, гаварыў на сесіі старшыня Жлобінскага райвыканкома Г. Рабцаў. Ён, у прыватнасці, прапанаваў стварыць пры райвыканкомах аддзелы капітальнага будаўніцтва.

Шмат цікавага і павучальнага расказаў дэпутатам старшыня калгаса «Ленінскі сцяг» Рэчыцкага раёна С. Савянок. У пяці брыгадах тут пабудаваны муравяныя клубы, ёсць у калгасе свая бальніца. І ў той жа час прадугледжанае культурна-бытавое будаўніцтва тармозіцца з-за адсутнасці будаўнічых матэрыялаў і аўтатранспарту. У раёне ёсць, напрыклад, свой лес, але па нарадах калгас можа атрымаць яго толькі ў іншых раёнах. Гэта нязручна і эканамічна нявыгадна.

Канкрэтнымі, дзелавымі прапановамі, накіраванымі на выкананне рашэнняў партыі і ўрада, былі выступленні дырэктара саўгаса «Бярозні» Гомельскага раёна С. Якімава, старшыні Радзінскага сельсавета Хойніцкага раёна М. Рабко, старшыні Светлагорскага райвыканкома П. Загорскага і іншых дэпутатаў.

У рашэнні сесіі намечаны канкрэтныя меры па паляпшэнню жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў вобласці.

Д. РАДЗІНСКІ,
кар. «Літаратуры і мастацтва».

КАНЦЭРТЫ ДРУЖБЫ

Дарога, што вядзе ў калгас «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна, упрыгожана чырвонымі сцяжкамі. Адна за адной пад'язджаюць машыны. Калгаснікі сельскагаспадарчых арцелей «Савецкая Беларусь», «Дружба», імя Жданава, «Усход», імя Свярдлова з песнямі едуць на канцэрт хору імя Пятніцкага ў вёску Чапялі.

Сама прырода падрыхтавала гэты цудоўны амфітэатр, засланы зялёным дываном духмяных траў. Паслухаць славутых спевакоў сабралася звыш чатырох тысяч калгаснікаў. Тут былі старыя людзі і моладзь, паляводы, жывёлаводы, механізатары, вучні, інтэлігенцыя.

Хлебам-соллю сустракаюць дарагіх гасцей даярка Герой Сацыялістычнай Працы Л. Нічыпарук, свінарка М. Капусцінская. Старшыня калгаса «Савецкая Беларусь» Ул. Бядуля сардэчна віншуе гасцей, якія прыехалі з канцэртам. Са словам у адказ выступіў дырэктар хору І. Фадзееў.

Затым адбыўся вялікі канцэрт гасцей. Увесь «зялёны тэатр» гарачымі апладысментамі суправаджаў кожны нумар канцэрта. У заключэнне вучні — дзеці калгаснікаў — паднеслі артыстам кветкі. Калектыву быў уручаны памятны сувенір.

Закончыўся канцэрт. Пачаліся сяброўскія гутаркі артыстаў з калгаснікамі. І тут выявілася, што ў хоры імя Пятніцкага спяваюць і беларусы. Гэта артысты Алег Галубовіч, Кацярына Лявонава, Аляксандр Мітраховіч, Аляксандр Варанкоў.

Хор імя Пятніцкага выступаў у Баранавічах, Ляхавічах, Пінску, Камянцы, Брэсце, Кобрыне. На гэтых канцэртах пабывала звыш 15 тысяч гледачоў.

ПРАЦАЎНІКАМ ВЁСКІ

У рэспубліцы праходзіць конкурс на лепшае абслугоўванне працаўнікоў вёскі калентывамі мастацкай самадзейнасці. Уключыліся ў гэта спаборніцтва і аматары мастацтва Чачэрскага раёна. У конкурсе прымаюць удзел 49 калентываў мастацкай самадзейнасці сельскіх клубаў і бібліятэк.

Актыўна працуе калектыў мастацкай самадзейнасці Чачэрскага Дома культуры. 14 разоў выязджалі з канцэртамі артысты-аматары. Іх цёпла прымалі жыхары Літвінавіч, Журавіч, Шохаўкі, Забалоцця і іншых вёсак. У праграме канцэртаў — беларускія, рускія і ўкраінскія народныя песні і танцы, мастацкае чытанне, сцэнкі, інтэрмедыі.

Актывізавала работу агітбрыгада раённага Дома культуры. Два-тры разы на тыдзень выступаюць самадзейныя артысты ў вёсках свайго раёна. Яны падрыхтавалі цікавую і разнастайную праграму, прысвечаную выбарам у Вярхоўны Савет СССР.

Часта выступаюць перад сельскімі гледачамі калектывы мастацкай самадзейнасці Літвінавіцкага, Дудзіцкага, Залескага, Матнявіцкага сельскіх клубаў.

Радуе, што конкурс памагае нараджэнню новых калентываў. Добры калентыў нядаўна створаны ў Аторскім сельскім клубе (кіраўнік К. Сясьнова). За месяц яго ўдзельнікі шэсць разоў выязджалі ў калгасы і саўгасы з канцэртамі. Новы калентыў створаны ў Барсуноўскім сельскім клубе.

Я. КРАЎЧАНКА.

У СТУДЭНЦКІМ ТЭАТРЫ

РЭПАРТАЖ

Я быў на свяце... Ну, вядома ж, на свяце! Таму што было дружна, весела і вельмі радасна.

Пачну з канца.

Гераіня стаяла на авансцэне. На самым краёчку. Слёзы на вачах. Туды, у чорны праход залы, панеслі яе каханага. Забітага. Яна не бачыла ні залы, ні людзей, што сядзелі ў ёй. Яна бачыла толькі яго, яна была з ім. А зала ўжо мінуту пляскае ў далоні. А потым усе падняліся і ў сто галасоў закрычалі: «Малайцы, малайцы!..» Тады твар у гераіні разгладзіўся і засвяціўся збянтэжанай, стомленай і шчаслівай усмешкай. І не стала гераіні, а зноў з'явілася на свет студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта Святлана Шкрэда. І хтосьці крыкнуў:

— Падкінем гераіню!

Потым віншавалі рэжысёра — заслужанага артыста Латвійскай ССР А. Озерава.

Так закончыўся ў студэнцкім тэатры БДУ спектакль «Вестсайдская гісторыя».

Уласна кажучы, гэта была яшчэ і не прэм'ера. Прэм'ера будзе восенню, калі ўсе збяруцца. А цяпер была толькі здача. Праўда, з гледачом.

А глядач быў што трэба! Самы ўважлівы, самы свой: перад такім іграць прыемна.

Студэнты старанна сачылі за перыпетыямі п'есы, бурна рэагавалі. Але — самае галоўнае — яны перажывалі за артыстаў. Ім так хацелася, каб тыя іграліі яшчэ лепш. І, памагаючы ім у падыходзячых выпадках, пляскалі ў далоні. А артысты вельмі стараліся. Я і не заўважыў, як праляцелі дзве гадзіны.

Што гэта было? Мастацтва? Так, было і мастацтва. Я бачыў прывабнага хлопца, завуць яго Алег Пятроў, які так арганічна, так натуральна трымаўся на сцэне, што калі яго героя, Рыфа, па дзеянню, забілі, я міжволі падумаў: як шкада, што ён больш не з'явіцца на сцэне.

Аніту, дзяўчыну з Пуэрта-Рыка, іграла Тамара Скудная. Яна «зрабіла» вобраз. Я гавару «зрабіла», таму што я бачыў прыстасаванні, якія прыдумала дзяўчына і якія «працавалі» на вобраз. Атрымалася і страсная лаціна-амерыканка, і любячая сястра... Быў жывы чалавек, быў характар. Гавораць, што Тамара два разы няўдала здавала ў тэатральны інстытут. Не ведаю, што знайшлі ці не знайшлі ў ёй прыдзірлівыя педагогі, але як бы ні склаўся лёс дзяўчыны, я ўпэўнены: тэатр яна не пакіне.

Вядома ж, гэта была і самадзейнасць. Трагічныя ролі п'есы Артура Лорэнса не заўсёды былі па сіле хлопцам, тут майстэрства патрэбна. Але было самае галоўнае: адносіны гэтых людзей да мастацтва тэатра. Яны вельмі любяць яго, і, я сказаў бы нават, — да самазабыцця. Спектакль ішоў хутка, на адным дыханні. Хлопцы так увайшлі ў ролі, што не абышлося без кур'ёзаў. Адна актрыса ўляпіла свайму партнёру самую сапраўдную аплявуху... А адзін з хлопцаў так захапіўся бойкаю, што, калі па ходу п'есы трэба было ўцякаць, скочыў у залу і дзесьці толькі ля пятага ряда апамятаўся, пабег назад...

Чаму хлопцы выбралі п'есу з амерыканскага жыцця?

Па-першае, яны іграюць анагодкаў, такіх жа, як яны, хлопцаў, толькі амерыканскіх. І потым — ім хацелася ўявіць сябе на іх месцы. І параўнаць. Сябе і іх... І яны паказалі нам жыццё гэтых амерыканскіх хлопцаў, жыццё страшнае і безвыходнае.

Дзве шайкі — «Акулы» і «Ракеты» складаюцца з хлопцаў, што жывуць на суседніх вуліцах і ваююць паміж сабою. «Ракеты» — гэта карэнныя, «сапраўдныя» амерыканцы, «Акулы» — дзеці пуэртарыканцаў, якія прыехалі ў «свабодную» Амерыку шукаць шчасця. Варожасць на глебе нацыянальнай няроўнасці. Але самыя галоўныя карэнні гэтай няроўнасці знаходзяцца глыбей. Гэта жыццё, цяжкое, жабрацкае, бесперспектыўнае, прымушае звярэць людзей з ранняга маленства. Яны становяцца псіхічна знявечанымі, і гэта іх роспач б'е кулаком і нажом. Я здаю сябе на тым, што асацыятыўна думаю пра тых хлопцаў, якія забіваюць цяпер бязвінных людзей у В'етнаме.

Самадзейныя артысты расказалі нам і пра гэта.

Вось што здолеў студэнцкі тэатр!

В. ЗАВІЗІЁН,
студэнт-завочнік тэатразнаўчага аддзялення Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.

АРШАНСКІ ЛЯНОК

Учора на Аршанскі льнокамбінат прыйшла радасная вестка. За вялікія поспехі ў рабоце Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 1 чэрвеня 1966 года ўзнагародзіў Аршанскі льнокамбінат Міністэрства лёгкай прамысловасці Беларускай ССР ордэнам Леніна.

Аб клопатах майстроў аршанскіх тканін расказвае артыкул, які мы прапануем увазе чытачоў.

Я адчыняю дзверы з шыльдай «Мастацкая майстэрня», уваходжу ў вялікую залу, залітую сонечным святлом, і спыняюся ў здзіўленні: маскі, ляпныя разьбы на сценах, скульптуры. За сталамі мастакі... Майстэрня Аршанскага льнокамбіната ці студыя выяўленчага мастацтва? Але дастаткова зірнуць на сталы — і становіцца ясна: тут ствараюцца эскізы малюнкаў для каляровых і беласнежных абрусаў, пакрывалаў, парцьераў, ручнікоў.

Старанна абводзіць блакітным алеткі мастак Аляксандр Волкаў. На стале, на планшэтах, прыстаўленых да сцяны, і проста на падлозе — варыянты абруса. Побач з ім — мастакі Вікцар Фурман і Адольф Вараноўіч.

Тут жа ў майстэрні працуюць дэсінатары, каларысты — не менш важныя стваральнікі прыгажосці будучай тканіны. Яны распрацоўваюць тэхналогію выманання задуманага мастакамі малюнка, структуру тканін, колер.

— Я люблю ездзіць на Нарач, — расказвае мастак Адольф Вараноўіч. У чаёй цётні там, ля Нарачы, у вёсцы, дзе і нарадзіўся, у куфры знаходжу шмат цікавых тканін, вышыван — усё, што ёй дасталося яшчэ ад маёй бабулі ў пасаг. Вось была майстрыха! Пасля такой паездкі цэлы год новыя кампазіцыі стараю.

Ён раскладвае на падлозе малюнкі. Іх многа. Своеасаблівыя, стылізаваныя, дэкаратыўныя пейзажы гуашшу — шэра-серабрыстая, ружова-аранжавая зімовая раніца, прасторы зялёнага лугу, спакойная цішыня возера. Усе гэтыя матывы я ўбачыла потым у яго работах — абрусах, пакрывалах, парцьерах...

Начальнік майстэрань, галоўны мастак льнокамбіната Барыс Пятровіч Арлоў, не адрываючыся ад работы (грунтуе пад палатно нацягнены на планшэт вялікі ліст паперы), гаворыць пра свае планы:

— Задумаў ансамбль: пакрывала, абрус, парцьеры. Хочацца паказаць дэкаратыўныя якасці натуральнага, непадфарбаванага льнянога палатна ў спалучэнні з белым у абрусе і мяккімі пастэльнымі колерамі ў шторах. Малюнак уяўляецца мне простым, лаканічным, ён гарманічна ўвойдзе ў сучасны інтэр'ер. Парцьеры будуць аблегчанымі, а пакрывала будзе здавацца цяжкім. Над стварэннем гэтага ансамбля мы працуем разам з мастаком-дэсінатарам Антанінай Сцяпанаўнай Лынавай.

Наша размова працягваецца ўжо ў асартыментным набінеце — выставачным паноі, дзе сабраны ўзоры вырабаў Аршанскага льнокамбіната за ўсе гады (з 1961). Дзве сцяны кабінета ад столі да падлогі здрапіраваны парцьерамі і парцьернай тканінай. Вось тканіна, на якой выразна праступае на суровым льняным полі арнамент, тут гарманічны рытм каляровых бліскучых палос рознай шырыні. Мастакі дасягаюць цікавых эфектаў, разнастайнай фактуры, уводзячы ў тканіну штапельныя і баваўняныя ніткі. Пры стварэнні ўзораў для парцьераў улічваецца агульны характар сучаснага інтэр'ера. Напрыклад, для пакояў з нізкай столлю прапанаваны парцьеры з вертыкальным малюнкам. Такія тканіны быццам павялічваюць вышыню памяшкання. Іх пяшчотныя, мяккі каларыт адпавядае характару сучаснай мэблі. Парцьерная тканіна лёгкая і сонечная. Мастакі паказваюць новыя варыянты парцьераў, ручнікоў, сурвэтак. Вось малюнкі, у якіх выкарыстаны стылізаваныя матывы гліняных свістулек («Свістулька»), раслінныя матывы («Сад», «Траўка», «Восень»). Некаторыя ўзоры абрусаў вылучаюцца не толькі своеасаблівым малюнкам, але і цікавымі суадносінамі беленага і натуральнага лёну. У гэтых рэчах асабліва адчуваецца блізкасць з народнымі льнянымі вырабамі, традыцыйнымі беларускімі посцілкамі.

Паказалі мне і выкананае спецыяльна для гасцініцы «Мінск» у Маскве пакрывала «Нарач» і парцьеры «Мінск». Тут аршанскія мастакі ўмела ажывілі ў зусім новай манеры ўзоры традыцыйнага беларускага ткацтва.

Але вось на тварах маіх субяседнікаў я бачу засмучэнне. Мне паказваюць абрусы і пакрывалы са старым, 15—20-гадовай даўнасці, ілжыва пышным аздабленнем, выпадковых колераў. Гэта выпускаецца на камбінаце і сёння — «для вёскі», як я чула, па заказах гандлёвых арганізацый. Бясспрэчна, абстаноўку сялянскай хаты трэба ўлічыць, як і ўлічыць цягу частні пакупнікоў да традыцыйнага льнянога пакрывала ці абруса з арнамантам у цэнтры. Чым больш шырокі асартымент, тым паўней будзе задаволены попыт людзей з рознымі густамі. Але ж трэба шукаць і ў такіх рэчах прынцыпова новыя вырашэнні! Улічваць патрэбы пакупніка — зусім не значыць дагаджаць кожнаму нявыхаванаму густу і выпускаць нешта бязглузда аранжавае або фіялетава-зялёнае з букетамі і вензелямі.

Вядома, новыя малюнкі, новыя кампазіцыйныя вырашэнні тканіны не заўсёды і не адразу прымаюцца пакупнікамі. Тут неабходна няспынная актыўная і дзейсная прапаганда вырабаў, у якой павінны прымаць удзел і мастакі камбіната і гандлёвыя арганізацыі. Боязь таго, што пакупніку нешта не спадабаецца, абмяжоўвае часта выпуск многіх цікавых вырабаў.

На камбінаце часам робяць рэчы, маючы на ўвазе толькі месца іх будучага ўжывання: у Прыбалтыку, напрыклад, — з выкарыстаннем узораў і малюнкаў прыбалтыйскага ткацтва, на Украіну — з украінскімі малюнкамі і г. д. З'явіліся вырабы вельмі падобныя на кастрамснія, красавінскія, іванаўскія. Прыхільнікі такіх вырабаў гавораць, што ўсё гэта робіць больш разнастайным асартымент, і акрамя таго, прывычныя рэчы лёгка ўспрымаюцца і купляюцца. Магчыма і так. Але мне здаецца, што такая тэндэнцыя рашнаджае выявіць мастацкія і стылявыя рысы, уласцівыя толькі аршанскім вырабам. Аршанскі лянок павінен быць аршанскім! І купляць яго будуць, бо ён будзе мець свае, аршанскія, асаблівасці. Мне здаецца, што тут мастакам трэба аказваць больш даверу, не баяцца, што новая рэч (калі яна сапраўды адпавядае эстэтычным патрабаванням) спачатку і не будзе карыстацца попытам. З цягам часу ён прыйдзе.

Нядаўна ў мінскім магазіне «Лянок» мастакі Аршанскага льнокамбіната наладзілі выстаўку-паказ узораў вырабаў і тканін, якія мяркуецца выпускаць сёлета. Яны прадэманстравалі, як можна іх выкарыстаць, паказалі, як добра спалучаюцца формы сучаснага жылога інтэр'ера з пастэльнымі расфарбоўкамі льняных тканін. Дырэктар магазіна Людміла Аляксееўна Рудая сведчыць, што попыт на новыя аршанскія тканіны і вырабы пасля выстаўкі прыметна павысіўся. Іх патрабуюць, просяць хутчэй выпускаць.

Мастакі і дэсінатары Аршанскага льнокамбіната шукаюць усё новыя і новыя магчымасці, каб выявіць разнастайную фактуру тканіны, стварыць арыгінальны каляровы рытм. І, знаёмячыся з гэтымі работамі, яшчэ і яшчэ раз шкадуеш, што некаторыя задумы застаюцца толькі ў кроках-накідах, не ідуць у вытворчасць. Для таго, каб выявіць сапраўды лепшыя ўзоры, нядрэнна было б на выстаўках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дэманстраваць і работы мастакоў тканіны. Тут бы можна было выявіць і праліні мастакоў, і адзначыць удалыя вырашэнні.

Мы часта гаворым пра сувеніры. А вырабы з лёну — цудоўны сувенір! Сувеніры гэтыя могуць складацца са спецыяльных ансамбляў (пакрывала, абрус, парцьера або дэкаратыўны льняны габелен), з набору каляровых сталовых сурвэтак, дзіцячых ручнікоў, набору рознаколяровых чайных абрусаў і г. д. Выпуск такіх сувеніраў і афармленне ўпакоўкі па сіле аршанскім майстрам.

На льнокамбінаце цяпер асвойваюць выпуск льняных тканін з дабаўленнем лаўсану, які надае матэрыі новыя ўласцівасці. Тканіна з лаўсанам не мнецца, з яе можна шыць верхняе адзенне. Я бачыла першыя ўзоры. Думаецца, што мастакі і дэсінатары камбіната знойдуць для гэтых тканін цікавую фактуру, малюнак — і мы ў самы бліжэйшы час будзем ганарыцца аршанскімі тканінамі для адзення, як мы сёння ўжо ганарымся якасцю і прыгажосцю аршанскіх парцьер, пакрывал, ручнікоў.

Браніслава ЛОБАН.

Орша.

ВЫШЭЙ ЗА ЭЙФЕЛЕВУ ВЕЖУ

Хутка над дахамі дамоў жыхароў Лепельшчыны зніжуць вялікія і нязручныя прыёмныя тэлевізійныя антэны. Ушацкі тэлерэтранслятар, будаўніцтва якога ідзе поўным ходам, зробіць устойлівым прыём тэлевізійных перадач у радыусе больш ста кіламетраў.

Будаўніні распачалі мантаж 350-метровай вежы перадаючых антэн. Рыхтуецца да здачы 18-кватэрны жылы дом для абслугоўваючага персаналу.

А. АРЦЕМАЎ.

Скончаў рабочы дзень...

СТВОРАНА МІКАЛАЕМ БОРТНІКАМ

Ленінскі пакой Кастрычніцкага раённага аддзела міліцыі. Напісаныя маслам партрэты Леніна, Дзяржынскага, Фрунзе. Дошка выдатнікаў. Лозунгі і плакаты. Стэнды «Будні райаддзела», «Жыццё і дзейнасць Ул. І. Леніна». Усё гэта з густам зроблена працавітымі рукамі старшага сяржанта міліцыі Мікалая Васільевіча Бортніка.

Мы сядзім з Мікалаем Васільевічам за маленькім круглым столікам. Сціпла расказвае ён пра сябе, пра сваё захапленне. Дзе б ні быў ён, дзе б ні працаваў—усюды панідаў аб сабе памяць. У арміі афармляў ленінскія пакоі, клубы, памагаў таварышам выпускаць насценныя газеты і баявыя лістні.

Прыйшоўшы з арміі, паступіў у міліцыю. Служыў у навалерыйскім дывізіёне. І тут знайшлася работа яго таленту.

У Кастрычніцкім аддзеле Мікалая Васільевіча паважаюць не толькі як добрага аператыўнага работніка. Патрэбна тэрмінова лозунг напісаць — калі ласка. Выпусціць «маланку», аформіць новы стэнд — Мікалай Васільевіч не спашлецца на занятасць. Хаця клопатаў у яго таксама нямала: служба, сям'я. Дзве дачкі растуць: Ала ў трэцім класе вучыцца, Оля — у пятым. Відаць, цяга да мастацтва перадалася ў спадчыну дзяўчынкам: абедзве яны таксама малююць.

М. ЗНАК.

ЗАХАПЛЕННЕ

Якаў Самсонавіч Замской працуе выкладчыкам у Мінскім тэхнікуме лёгкай прамысловасці. А свой вольны ад работы час аддае выяўленчаму мастацтву — піша акварэлі, стварае гравюры.

Самадзейнага мастака захапляюць мінскія краявіды, гарадскія ўскраіны, дзе сучасныя шматпавярховыя дамы мяжуюць з палямі, прыгарадныя магістралі. У час паездак па рэспубліцы і за яе межы Я. Замской не расстаецца з эцюднікам. Так у яго хатняй «галерэі» з'явіліся пейзажы Масквы, Кіева, Карпацкага краю.

П. МІХАЙЛАЎ.

І ГРАФІКА, І АКВАРЭЛЬ

У Пінскім краязнаўчым музеі рэгулярна наладжваюцца выстаўкі твораў самадзейных мастакоў. Сёлета ў красавіку наведвальнікі музея пазнаёміліся з творчасцю настаўніка школы № 3 горада Пінска — Івана Данілава.

Самадзейны мастак працуе як графік і акварэліст. Ён стварае батальныя кампазіцыі, партрэты сучаснікаў, аўтапартрэты, пейзажы. Захапляецца і ілюстрацыяй. На выстаўцы былі паказаны яго ілюстрацыі да твораў Лермантава і Межалайціса.

В. ЗАВІДАЎ.

Брэст.

ЛЮБІМЫЯ ВОБРАЗЫ

На Мінскім маторным заводзе добра ведаюць энергетыка цэха зборкі і выпрабавання матораў Сяргея Шынко. Ён — майстар сваёй справы, рацыяналізатар.

Наведвальнікі, рэспубліканскіх, абласных і гарадскіх выставак самадзейнага мастацтва таксама ведаюць імя гэтага юнака. Ён—мастак, скульптар. У яго жывапісных і скульптурных творах расказваецца аб працы, будаўніцтве, роднай прыродзе. Сярод любімых вобразаў самадзейнага мастака — вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна.

І. ЦІХАНАЎ.

СА ЗВЫЧАЙНАЙ ГЛІНЫ

Алег Марозаў — студэнт Мінскага інстытута фізічнай культуры. Бацькі яго жывуць у Клічаве. І калі ён прыязджае да іх на канікулы, дык большасць вольнага часу аддае выяўленчаму мастацтву.

Са звычайнай чырвонай гліны ён вылепіў партрэт Уладзіміра Ільіча Леніна. У скульптуры адчуваецца ўмельства самадзейнага мастака перадаць цеплыню свайго пачуцця да правадыра. З гіпсу ён выканаў партрэты маладой жанчыны і рабочага.

Шмат часу аддае Алег Марозаў маляванню. Найбольш удалыя яго малюнкі — «Аўтапартрэт» і «Ленінская вуліца ў Клічаве».

А. ГАГБУЗАЎ.

Магілёўская вобласць.

Дзяржаўнае выдавецтва «Беларусь» выпускае ў свет «Бібліятэчку атэіста і «Гутаркі з веруючымі». Нядаўна выйшлі з друку некалькі брашур з гэтых серый. На здымку вы бачыце вокладкі кніг Р. Нядольскага «Якому богу пакланяюцца баптысты» і А. Осіпава «Не выратуе і не памілуе».

ДАРОГАМІ ПРЫБУЖЖА

Яшчэ не ўвабраўся ў сілу рабочы дзень у пагранічным горадзе над Бугам, а загадчык раённага аддзела культуры Мікалай Іванавіч Дарковіч падрыхтаваўся ў дарогу.

— Куды?—пытаюся.

— У клубы, бібліятэкі, — адказвае ён і запрашае мяне паехаць разам.

Я прыпамінаю, як год назад у такі ж самы цёплы майскі дзень мне давялося з Мікалаем Іванавічам (тады ён працаваў інструктарам райкома партыі) наведаць многія калгасныя і саўгасныя клубы Брэстчыны. Мой спадарожнік не абмінаў ніводнай вёскі, гутарыў амаль з кожным сустрэчным. Спачатку заводзіў размову пра навіны: што робіцца, што зроблена па гаспадарцы, а затым цікавіўся, якія ж мерапрыемствы праводзяць мясцовыя работнікі культуры. І галоўнае, як цікава ўсё гэта робіць.

Так здарылася і на гэты раз. Я даведаўся пра новае, што з'явілася ў клубах і бібліятэках раёна за апошні час. Я тут маю на ўвазе час, які прайшоў пасля тых памятных дзён, калі ў Крамлі праходзіў гістарычны XXIII з'езд нашай партыі.

Вось, напрыклад, Чарнаўчыцкія сельскія бібліятэка і клуб. У мясцовым калгасе «Іскра» мне давялося пабываць мінулай зімою. І на гэты раз я не абмінуў тутэйшы музей рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, які знаходзіцца ў школе. Цікава было, а што яшчэ адкрылі краязнаўцы?

У музеі кідаецца ў вочы новая экспазіцыя «Людзі працоўнага подзвігу». Гэта расказ пра калгаснікаў, якія нядаўна адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Па матэрыялах музея і ў клубе, і ў бібліятэцы афармлена наглядная агітацыя. Дошкі паказчыкаў сацыялістычнага спаборніцтва брыгад, партрэтная галерэя вядомых людзей і плакаты пра іх метады працы, стэнды... Усё гэта, бадай, лепш за экскурсавода расказвае пра сённяшні дзень калгаса, яго людзей, пра далёкае мінулае тутэйшых мясцін, пра іх будучыню.

І ў наглядной агітацыі, і ва ўсёй культасветнай рабоце на першым плане—пашана да працы чалавека, да яго рэвалюцыйнага і баявога мінулага.

Вось некаторыя з мерапрыемстваў, што прайшлі ўжо сёлета: провады зімы, свята вясны, дзень механізатара, дні ўрачыстай рэгістрацыі нованароджанага. Запланаваны правядзенне свята ўраджаю, дня жывёлавода, урачыстых провадаў на службу ў Савецкую Армію і інш. Адзначаць новыя народныя святы і абрады стала традыцыяй. І трэба сказаць, што праходзяць яны цікава, з выдумкай. Тут многа дапамагаюць і самадзейныя артысты. А ім таленту не пазычаць.

Калгас мае свой духавы аркестр з васемнаццаці музыкантаў, харавы, драматычны і танцавальны калектывы. А колькі індывідуальных выканаўцаў! Сярод іх і чытальнікі мастацкага слова, і фокуснікі, і акрабаты... Самадзейныя артысты сваё майстэрства часта прысвячаюць таму ці іншаму калгаснику, яго добрым справам.

Калі мы зайшлі ў клуб, дык адразу кінулася ў вочы: пад столлю развешаны гірлянды з дзеразы, рознакаляровыя электрычныя лямпачкі, сцяжкі і шары. Адчувалася, што тут зусім нядаўна адбывалася нейкая ўрачыстасць.

— Гэта ж на тым тыдні ў нас быў «Блакітны агеньчык»,—тлумачыць загадчыца сельскага клуба Люба Казлоўская.—Прысвяцілі яго тэме «Чым ты шчаслівы, малады чалавек?» Выступалі бывалыя людзі. Яны ўспаміналі сваю маладосць, расказвалі пра цяжкае дарэвалюцыйнае жыццё, пра гераічныя дні Вялікага Кастрычніка і грамадзянскай вайны, пра незабыўныя вераснёўскія дні 1939 года, пра гераічныя справы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вядома, «Блакітны агеньчык» не абышоўся без танцаў, музыкі, песні, гульняў.

Такія вечары праводзяць многія сельскія работнікі культуры. Адчуваецца, што яны смела знаходзяць новыя формы работы.

Цікавыя вечары арганізоўваюць клуб і бібліятэка ў Лышчыцах. Вечары так і называюцца — лышчыцкія. Пра іх ідзе слава далёка па навакольных вёсках. Тут усе ведаюць, што такое «КВЗ». Гэта скарочаная назва «Клуба вясёлых і знаходлівых». У яго ёсць і журы, і каманды, і балельшчыкі — усё так, як і ў тэлевізійным, што перадаецца з Масквы ці Мінска. Толькі ў Лышчыцах тэматыка свая, з ухілам да гісторыі родных мясцін, яе людзей, да вясковых спраў. За месяц, а то і раней, каманды рыхтуюцца да чарговага пасяджэння клуба. І, вядома, кожная хоча перамагчы. Членам каманды даводзіцца перачытваць дзесяткі і сотні кніг, узбройвацца энцыклапедычнымі ведамі. Апрача гэтага, трэба ведаць і гісторыю роднага краю, сённяшнія справы яго людзей. Адказы на многія пытанні па гэтай тэме можна знайсці ў наглядной агітацыі клуба і бібліятэкі. На апошнім пасяджэнні «КВЗ» былі пытанні і пра рашэнні XXIII з'езда партыі, і пра космас, і пра перадавы вопыт вырошчвання цукровых буракоў, вялікія прыбыткі ад якіх мае арцель, і з баявой і рэвалюцыйнай гісторыі раёна, калгаса, пра літаратуру і мастацтва, і нават пытанне — колькі летась працадзён было ў перадавых паляводаў Марыі Якавук і Ганны Барысюк...

«За кубкам кавы»—так называюцца лышчыцкія вечары цікавых успамінаў. На іх ужо выступалі былыя франтавікі, падпольшчыкі, партызаны. Яны расказвалі моладзі пра мужнасць і гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Нядаўна ў турысцкім падарожжы па Венгерскай Народнай Рэспубліцы пабывалі сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса імя Мічурына Валянціна Клімовіч і бухгалтар-эканаміст Сцепаніда Разановіч. Работнікі культуры запрасілі сваіх аднавяскоўцаў у клуб на сустрэчу з гэтымі людзьмі. Валянціна і Сцепаніда расказалі пра жыццё братняга венгерскага народа.

— Усе выдаткі «КВЗ» бярэ на сябе наша праўленне калгаса, — зазначае загадчыца бібліятэкі Яўгенія Асіпук і тут жа нагадвае загадчыку клуба А. Вішнюку.—А ты, Алег, не забудзь успомніць і пра вечар «Шляхі-дарогі песні баявой».

— Дык мы ж яго яшчэ рыхтуем,—адказвае загадчык клуба.

Для ўдзелу ў гэтым вечары лышчыцкія культработнікі мяркуюць запрасіць ветэранаў вайны. Былыя воіны і партызаны раскажуць, як песня дапамагала салдату ў цяжкіх паходах, натхняла на змаганне з ворагам. Харавы калектыў ужо развучвае песні. Рыхтуецца да вечара і сельская бібліятэка: падбірае неабходную музычную літаратуру, афармляе кніжныя выстаўкі пра песні грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Па дарогах Брэсцкага раёна мы праехалі больш сотні кіламетраў, пабывалі ў дзесятках клубаў, бібліятэк. І ўсюды адчуваецца, з якой любоўю ідзе падрыхтоўка да вялікіх дат—50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

На наступны дзень я зазірнуў у раённы аддзел культуры. Яго загадчык Мікалай Іванавіч Дарковіч перабіраў свае ўчарашнія запісы.

— На чарговым семінары работнікаў культуры, — зазначае ён,—абмяркуем тое новае, што нарадзілася за апошні час у нашых клубах і бібліятэках. Хочацца, каб гэтае новае, перадавое стала здабыткам усіх калгасных і саўгасных асяродкаў культуры...

Я слухаў Мікалая Іванавіча і веру ў яго словы. Ды як тут не паверыць! Работнікам культуры Брэсцкага раёна і іх актывістам далёка па вопыт хадзіць не трэба.

А. МАХНАЧ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ЗА ПРЫВАТНЫМ ФАКТАМ — ПРАБЛЕМА

РАСЧАРАВАННЕ СВЯТЛАНЫ ЛАСІЦКАЙ

ПРЫЗНАЦЦА, пачутая гісторыя спачатку здалася мне даволі банальнай. Дырэктар магазіна папаўся на крадзяжы. На жаль, у нашы дні гэта яшчэ не вялікая сенсацыя. Таму слухаў я расказ без асаблівай цікавасці.

Адно месца ў гэтай гісторыі, аднак, насцярожыла. Аказваецца, дзяўчаты-прадаўшчыцы, якія працавалі пад кіраўніцтвам злодзея і якія, як высветлілася, былі ні ў чым не вінаватыя, падалі заявы аб звальненні, бо, як яны пісалі, «расчараваліся ў сваёй прафесіі».

...Начальнік аддзела кадраў «Мінпрамгандлю» Мікалай Аляксеевіч Тамілін — пажылы чалавек у шэрым касцюме, кідае дапытлівы позірк на маё карэспандэнцкае пасведчанне, і суровы твар яго раптам расплываецца ў лагоднай усмешцы:

— Да вашых паслуг.

— Я па справе Савельева.

— Савельева? Гэтага злодзея? Ён яшчэ у рэдакцыі скардзіцца! Нягоднік!

На твары Мікалая Аляксеевіча выступаюць чырвоныя плямы.

— Мяне цікавяць прадаўшчыцы, што з ім працавалі.

— Ах, пра-адаўшчыцы... — цягне начальнік. — Як жа, як жа, ведаю... Упрошвалі іх вярнуцца.—Мікалай Аляксеевіч, нахіліўшыся яшчэ бліжэй, нібы па сакрэту, паведамляе: — Сам упрошваў. Асабіста. У нас жа кадраў — во! — як не хапае. Цякучка страшэнная. У нашай сістэме штогод пакідаюць работу 250—300 чалавек — чацвёртая частка ўсіх работнікаў. У асноўным моладзь. А чаму? З-за лёгкадумнасці. Прафесія, бачыце, ім не па душы. А чым, скажыце, яна горшая за іншыя?

Я згаджаюся, што не горшая, і прашу ў Мікалая Аляксеевіча адрасы дзяўчат, што працавалі з Савельевым.

Устрывожана паглядзеўшы на мяне, быццам у маёй просьбе нейкая пагроза для яго, начальнік аддзела кадраў доўга капаецца ў папках і паперах, якімі завалены стол. Нарэшце, падае мне некалькі выпісаных адрасоў.

...Яна зусім яшчэ дзяўчо, гэтая Святлана Ласіцкая. Тоненькая, з косамі. Шэрыя вочы глядзяць адкрыта і шчыра. І толькі недзе ў глыбіні іх, мне здаецца, застыў страх.

— Калі даведалася пра ўсё, думала звар'яцею. І дома не раскажаш — сорамна, мяне ж папярэджвалі...

Так, дома яе папярэджвалі: і бацька, і маці, і старэйшая сястра. Не, папярэджвалі — не тое слова. Ёй проста забаранілі думаць пра прафесію гандлёвага работніка.

— Вучыся лепей на ўрача ці на настаўніка, — гаварыў бацька, між іншым, па рабоце звязаны з гандлем.

— Ты вельмі наіўная і даверлівая, каб працаваць у гандлі, — гаварыла сястра, работніца магазіна.

— Ну і што, калі даверлівая? — пярэчыла Святлана. — Што ў гэтым благога? Мы ж усе савецкія людзі і павінны давяраць адзін аднаму.

Дома толькі пасміхаліся, слухаючы гэтыя разважанні. Што, маўляў, з яе возьмеш —дзіцё.

Калі бацька з маці паехалі ў адпачынак, Святлана падала заяву ў гандлёвую школу.

— Рашыла паставіць бацькоў перад фактам, — усміхаецца Святлана.

Дома быў скандал. Але дзяўчына паказала характар — дамаглася свайго.

— У школе, ведаеце, як строга было? Былі мы на практыцы ў магазіне, дык адна наша дзяўчына ўзяла карабок запалак — адразу выключылі са школы. І правільна. Сёння ўзяла запалкі, а заўтра яшчэ што-небудзь захочацца ўзяць.

Пасля школы паслалі Святлану Ласіцкую ў вялікі прамтаварны магазін.

— Дужа ж спадабалася мне работа. Цэлы дзень вакол цябе людзі — пажылыя, маладыя, дзеці. У кожнага свой густ, свае патрабаванні. Прымярае, скажам, пажылая жанчына сукенку і на цябе ўмольна глядзіць, падыходзіць ці не — і фасон, і афарбоўка. А ты ёй тлумачыш, як прафесар на лекцыі, — па поўную фігуру такая афарбоўка не падыходзіць і г. д. І слухае жанчына, нібы не яна за цябе старэйшая, а наадварот.

І дырэктар магазіна Іван Пятровіч Савельеў таксама вельмі спадабаўся Святлане. Пажылы, далікатны, ветлівы. Святлана ведала, што да яе прыходу тут працавалі ў асноўным пажылыя прадаўшчыцы. Па просьбе Івана Пятровіча іх перавялі ў іншыя магазіны, а сюды паслалі моладзь.

— Люблю моладзь, — сказаў ён неяк, сабраўшы прадаўшчыц. — Асабліва сумленную, працавітую, дружную.

Адным словам, усё ішло добра. Аднойчы, калі прадаўшчыцы прыйшлі на работу, дырэктар аб'явіў:

— Зачыняйце магазін, прыехалі рэвізоры.

—Першая ў маім жыцці рэвізія. Але сустрэла вестку я спакойна. Ведала, што ў маёй секцыі ўсё ў парадку, — кнігі ўліку тавараў вяла акуратна, касу таксама.

Неяк праз дзень пасля рэвізіі Іван Пятровіч паклікаў Святлану ў кабінет.

— Вось так, дзяўчынка дарагая, не хапае па тваёй секцыі аж 80 рублёў.

У дзяўчыны на момант усё паплыло перад вачыма.

— Не можа быць, Іван Пятровіч... Я ж...

— Што ж, рэвізія памыляецца?

— Няўжо вы не верыце мне? Няўжо вы думаеце, што я магла ўзяць?

Твар дзяўчыны стаў мокры ад слёз.

— Супакойся. — Дырэктар падышоў да Святланы і ласкава паляпаў яе па плячы.—Веру. Веру, даражэнькая, што не ўзяла. Ты ж сумленная. Толькі даверлівая вельмі. Вось у суседняй секцыі Зіна працуе, яна ў цябе і ўзяла. Упэўнены ў гэтым.

— Што вы, што вы, Іван Пятровіч! Зіна вельмі сумленная дзяўчына, і Юля і Ганна...

— Э-э, сумленныя... Каб ты разумная была, дык адпомсціла б ім — яны ў цябе ўзялі, а ты ў іх...

Дзяўчына адхіснулася.

— Жартую, жартую... Але ж грошы ўнесці табе давядзецца. Не, лепш ты купі тавараў на суму, якой не хапае. А я потым запатрабую паўторнай рэвізіі, і ўсё будзе ў парадку. Грошы табе потым вярну.

Святлана пайшла па знаёмых пазычаць грошы, потым купіла некалькі жаночых гарнітураў і паклала ў складзе.

Неяк адна з прадаўшчыц — Юлія Каждан спытала ў Святланы, чаму яна ходзіць такая сумная. І дзяўчына пад строгім сакрэтам расказала пра ўсё сяброўцы.

— Дык і ў мяне ж такая гісторыя, — усклікнула тая, —таксама не хапае грошай, і дырэктар папярэдзіў, каб я асцерагалася цябе. Але я яму такое сказала, што... А цікава, Зіну і Галю ён выклікаў?

Аказалася, выклікаў паасобку і іх, і кожнай па сакрэту паведаміў, што ў секцыі не хапае тавараў і што, відаць, радзяжом займаецца нехта з прадаўшчыц.

Развязка наступіла праз некалькі дзён. Дзяўчаты пайшлі да начальства, усё расказалі. Назначылі новую рэвізію, яна выявіла буйную растрату ў магазіне. Дырэктара знялі з работы, выключылі з партыі і аддалі пад суд.

— Як бачыце, зло пакарана і ці варта зноў варушыць гэтую гісторыю? — спытаў у мяне дырэктар «Мінпрамгандлю» Іван Лукіч Катэнка.

Так, зло пакарана. А ці не занадта вялікай цаной, каб можна было ўсё забыць і супакоіцца?

Я пытаюся пра гэта ў Івана Лукіча, і ён няўцямна паціскае плячыма:

— Страта, нанесеная дзяржаве, пакрыта поўнасцю.

Дырэктар мае на ўвазе матэрыяльныя каштоўнасці. Але чым вымераць маральную шкоду, маральную траўму, што была нанесена дзяўчатам?

— Я цяпер не магу нікому верыць, — сказала мне Юлія Каждан.

Няхай у гэтых словах ёсць і нейкая рысоўка, але ж аб'ектыўна атрымалася, што жыццё, па якім дзяўчаты зрабілі першыя самастойныя кроні, адразу дало ім такі ўрок, які моцна ўдарыў па тых уяўленнях, па тых паняццях, што склаліся пад уздзеяннем школы, кніг, тэатра, кіно — усяго таго, што мы называем комплексам выхавання. І як шкада, як крыўдна, што класічная абывацельская сентэнцыя, звернутая да моладзі: «Вы яшчэ не ведаеце жыцця, лунаеце ў воблаках»—на гэты раз здзейснілася.

Па чыёй віне? Здаецца, адрас адзін — Савельеў. Кажуць, што ён — не тыповая фігура. Няхай не тыповая. Ва ўсякім разе, не часта цяпер можна сустрэць чалавека, у якім бы так унікальна спалучаліся подласць, ілжывасць, дэмагогія.

Але гэтая не тыповая фігура трапіла на апошнюю пасаду даволі звычайным шляхам і лічылася «моцным кадрам». Гэта тым больш дзіўна, што якасці характару Савельева не былі сакрэтам для начальства. Было добра вядома, што ён маральна нячысты чалавек, інтрыган, у вочы можа сказаць адно, а за вочы другое, можа абылгаць чалавека (за гэта нават меў партыйнае спагнанне).

Але некалі ён трапіў на арбіту загадчыка магазіна і ў гэтай якасці, як ужо гаварылася, лічыўся моцным работнікам.

І вось я цяпер думаю: як магло здарыцца, што гэтаму тыпу быў даверены калектыў, ды яшчэ які — моладзь, якая толькі што ўступіла ў самастойнае жыццё?

Кіраўнікі «Мінпрамгандлю» разводзяць рукамі: маўляў, выпадковасць. Але паверыць у гэта, ой, як цяжка. Мне здаецца, усё гэта здарылася таму, што тут падыходзяць да работнікаў толькі з адной меркай, з адным крытэрыем — выконвае ці не выконвае план.

А ці дастаткова гэтага ў наш час? Так, тавар, грошы, план — гэта, вядома, вельмі важна. Але ж ці можна забывацца пра чалавека?

Чамусьці атрымоўваецца так: пакуль юнак вучыцца, аб яго выхаванні многа клапоцяцца. Нават цяжка сабе ўявіць, каб у школе ці ў інстытуце ў якасці выкладчыка, педагога мог доўгі час працаваць чалавек, падобны да Савельева. Божа, які б тут падняўся гвалт, колькі гнеўных слоў было б выказана наконт таго, што гэты чалавек дрэнна ўплывае на моладзь, і з якім бы трэскам ён вылецеў з навучальнай установы.

Чаму ж часта, не задумваючыся, мы аддаём тую ж дзяўчыну ці хлопца, што пайшлі працаваць, пад кіраўніцтва чалавека нікчэмнага, якога з-за яго маральных якасцей на гарматны стрэл нельга падпускаць да моладзі.

Таму што ніякай інструкцыяй, ніякім цыркулярам гэта не забаронена? Смешна, вядома. І ўсё-такі іменна такая думка прыходзіць у галаву. Бо паглядзіце, што зрабілі ў «Мінпрамгандлі» нават пасля таго, як аблічча Савельева было канчаткова раскрыта. Усю недастаючую суму грошай тут раздзялілі на ўсіх работнікаў, хоць было даказана, што браў толькі дырэктар. Дзяўчаты-прадаўшчыцы фармальна лічыліся матэрыяльна адказнымі асобамі, і таму іх прымусілі ўнесці грошы.

— Пасля суда над Савельевым грошы дзяўчатам вернуць, — гаворыць тав. Катэнка. — А пакуль што закон няўмольны — дзяржаве нанесена страта, яна павінна быць пакрыта.

Так, дзяржава не павінна несці страты. Але неяк не ўкладваецца ў галаве, чаму гэта трэба рабіць за кошт невінаватых? Можна сабе ўявіць, які гэта быў для дзяўчат удар пасля ўсяго перажытага.

Я пішу пра гэта і ўспамінаю раптам словы начальніка аддзела кадраў пра тое, што ў іх сістэме вялікая цякучка кадраў. Штогод да 300 чалавек пакідае работу.

Тав. Катэнка тлумачыць адсеў тым, што ў работнікаў гандлю прамысловымі таварамі выхадны дзень прыпадае на панядзелак.

— Ва ўсіх на нядзелю, а ў нас на панядзелак — вось і бягуць.

Не вельмі абгрунтавана. Між іншым, такі ж вялікі адсеў работнікаў, занятых і ў іншых галінах гандлю.

Вось што гаворыць старшы інспектар па кадрах Упраўлення гандлю Мінскага гарвыканкома Іван Андрэевіч Нікішкаў:

— Летась у Мінску пакінула работу ў гандлі 2 759 чалавек. Праўда, мы набралі новых. Але і цяпер адчуваецца вельмі вострый недахват — па самых мінімальных падліках каля 900 чалавек — прадаўцоў, касіраў, рабочых.

Інспектар дадае, што пакідае работу ў асноўным моладзь. І вельмі многія кіруюцца тымі ж матывамі, што і Святлана Ласіцкая, (Іван Андрэевіч ведае яе гісторыю).

У тым, што гэта так, я ўпэўніўся, пабываўшы ў Мінскай школе гандлёвага навучання. Дырэктар школы Клаўдзія Канстанцінаўна Салаўёва паклала перада мной стосік пісьмаў.

— Прачытайце і ўсё зразумееце.

«Дарагая Клаўдзія Канстанцінаўна. Піша ваша былая вучаніца Валя Юрчук. Раскажу вам пра сваё жыццё. Працую я ў дзевятым магазіне Заводскага райхарчгандлю. Хоць павінна я працаваць на гадзіну меней — мне ж толькі семнаццаць,—загадчыца прымушае стаяць поўны дзень. «Ты, кажа,— атрымліваеш, як прадавец, дык і працуй, як прадавец». Неяк я цяжка захварэла, потым прынесла бюлетэнь, а загадчыца і гаворыць: «Табе, мусіць, яго па знаёмству выдалі». Многа я тады паплакала. А выхадных дзён нам не даюць па некалькі тыдняў. Папросіш выхадны дзень, дык цябе яшчэ аблаюць. Наогул, загадчыца лае нас, маладых прадаўшчыц, самымі брыдкімі словамі. Некалі я марыла пра работу ў магазіне, цяпер зусім расчаравалася. Відаць, пайду на завод»...

Яшчэ пісьмо.

«...У школе ўсё было добра. Марылі пра тое, як будзем самастойна працаваць. Але вось дайшло да справы... Мяне і іншых дзяўчат адразу зрабілі матэрыяльна адказнымі. Мы і азірнуцца не паспелі, як прыйшлося з уласнай кішэні пакрываць недахват грошай. «А, вы не спраўляецеся, дык вось вам», — сказала начальства і накіравала на склад перабіраць бульбу... Сталыя вопытныя прадаўцы з нас смяюцца, маўляў, вучыліся, вучыліся, а нічога не разумееце. Некалі я з такой ахвотай пайшла вучыцца ў гандлёвую школу, а цяпер не магу вытрымаць, згодна на любую работу, толькі не ў гандлі. Ваша Тамара Акіменка».

— Крыўдна атрымліваць такія лісты, — гаворыць дырэктар, — Але што зробіш? Мы тут у школе вучым моладзь любіць сваю прафесію, пераконваем, якая яна важная, але прыходзіць дзяўчына працаваць у магазін і сутыкаецца з «прозай» жыцця. Вось нядаўна прыбягае да мяне адна з былых вучаніц і са слязьмі на вачах расказвае: «Адна пажылая жанчына заходзіла ў наш магазін і ўвесь час цікавілася, калі прывязуць пральны парашок «Мільву». Увесь час гэтай «Мільвы» не было, а потым неяк прывезлі, і якраз у той жа дзень зноў наведалася гэтая жанчына. Я ўзрадавалася і дастала ёй з-за прылаўка некалькі пачак парашку. Як накінулася потым на мяне загадчыца секцыі! Аказваецца, яна адклала «Мільву» для сваіх знаёмых...»

А то бывае, пашлём мы дзяўчат на практыку ў магазін, а яны ў адзін голас: «Не будзем працаваць, там у магазіне ўсе вагі няправільна ўстаноўлены — пакупніка ашукваюць...»

І вось мы ўжо ведаем — калі пачалася вытворчая практыка, чакай адсеву са школы...

Куды ж ідуць дзяўчаты? На завод звычайна. Там і заробак вышэйшы і ёсць куды пасля работы пайсці. Нават самы маленькі заводзік мае свой клуб, а то і Дом культуры. Там розныя гурткі, там мастацкая самадзейнасць. А ў гандлёвай сетцы што? Да вайны ў Мінску быў клуб гандлёвых служачых. Цяпер такога клуба няма, хоць армія гандлёвых работнікаў налічвае каля 16 тысяч чалавек. І калі трэба сабрацца на якую нараду, дык клянчаць яны памяшканне ў розных устаноў.

...Прыгадваецца адно месца з Дырэктыў па новаму пяцігадоваму плану, прынятаму XXIII з'ездам КПСС:

«...Паляпшэнне савецкага гандлю з'яўляецца адной з важных задач у гэтай пяцігодцы. Рознічны тавараварот дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю намечана павялічыць на 45 мільярдаў рублёў, або прыкладна на 43,5 працэнта...»

Каб ажыццявіць гэтую задачу, недастаткова мець многа тавараў, прыгожыя сучасныя магазіны. Трэба даць за прылаўкі гэтых магазінаў зялёную дарогу Святлане Ласіцкай і яе сяброўкам. Трэба, каб яны там адчувалі сябе сапраўднымі гаспадарамі, патрэбнымі людзьмі.

М. ЗАМСКІ.

З нашай пошты

«ПАЧЫНАЕМ ТРАДЫЦЫЙНЫ ВЕЧАР...»

Тыдзень назад я выпадкова сустрэў на вуліцы знаёмага студэнта політэхнічнага інстытута, і ён запрасіў мяне на літаратурны вечар.

— А ў якой зале вечар? — пацікавіўся я.

— Не ў зале, а проста на вуліцы, — адказаў знаёмы.

Гэта мяне зацікавіла.

Аказалася, што ўжо больш месяца кожную суботу каля новага кінатэатра «Піянер», што на вуліцы Энгельса, адбываюцца своеасаблівыя літаратурныя вечары...

Недзе каля дзесяці гадзін вечара мы падышлі да кінатэатра. Першае, што кінулася мне ў вочы, не мела ніякіх адносін ні да паэзіі, ні да прозы. На гранітным выступе пляцоўкі, які нагадвае своеасаблівы пастамент, два хлопцы пілі з рыльца «Гамзу» і рагаталі. Побач стаялі некалькі юнакоў і дзяўчат і сумна глядзелі на іх...

Але вось у кінатэатры скончыўся сеанс. Людзей прыбавілася. Хлопцы з «Гамзой» хуценька зніклі. Мой знаёмы ўскочыў на пастамент і падняў руку:

— Таварышы, увага! Пачынаем наш традыцыйны вечар... —І пачаў чытаць:

Не жалею, не зову, не плачу,
Все пройдет, как с белых
яблонь дым...

Людзей большала. А хлопец чытаў і чытаў — Маякоўскага, Ясеніна, Багдановіча. Потым вершы Юлі Друнінай аб вясне, дзявочым шчасці, каханні чытала нейкая дзяўчына з доўгімі косамі.

Натоўп рос. І вось з яго, спатыкаючыся, выйшаў чалавек у клятчастай кашулі.

— Пусціце мяне, — п'яным голасам нахабна патрабаваў ён, — я хачу выступіць... Я вам такое прачытаю!..

Вечар быў сапсаваны...

Я глядзеў на слухачоў, на ўважлівыя твары зусім маладых людзей, якія слухалі вершы, і думаў: справа задумана добрая. Але пры чым тут «Гамза» і п'янаватыя нахабнікі? Чаму ўсё адбываецца стыхійна, неарганізавана? І самае крыўднае — дзе? Пад вокнамі Саюза пісьменнікаў БССР, дзе ёсць Бюро прапаганды мастацкай літаратуры.

Ёсць у Мінску і тры буйныя маладзёжныя літаратурныя аб'яднанні, ёсць дзве маладзёжныя газеты. Ёсць, урэшце, гарком камсамола. Ці не варта ім зацікавіцца літаратурнымі вечарамі каля кінатэатра «Піянер», каб зрабіць іх сапраўды нарыснымі для аматараў паэзіі? Моладзь на гэтыя вечары прыходзіць — і не варта дазваляць гаварыць з ёю мовай паэзіі нейкім выпадковым людзям...

Ул. АЛЯХНОВІЧ.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У Рэспубліканскім тэатры юнага гледача адбылася прэм'ера па п'есе Вадзіма Карастылёва «Варшаўскі набат». Пераклад на беларускую мову зроблены паэтам Кастусём Кірэенкам.

У аснову п'есы пакладзена гісторыя трагічнай гібелі выдатнага польскага пісьменніка, педагога і ўрача Януша Корчака.

Спектакль паставіў рэжысёр Уладзімір Маланкін. Аформіў мастак Барыс Казакоў. Балетмайстар — С. Дрэчын. Музыка М. Вайнберга.

У галоўных ролях заняты Барыс Барысёнак, Людміла Барташэвіч, Антаніна Бендава, Уладзімір Раманоўсці, Павел Дубашынскі і Уладзімір Говар-Бандарэнка.

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР

Абмяркоўваем вылучаныя творы

ПРА ВЕЛІЧ РЭВАЛЮЦЫІ І ЧАЛАВЕКА

Паэма Аляксея Русецкага «Яго Вялікасць» атрымала прызнанне чытаючай публікі. Можна смела сказаць, што яна палюбілася чытачам. І гэта натуральна. Кожны, хто чытае паэму, — які б жыццёвы багаж ні меў за плячыма, ці ён стары камуніст, ці юны камсамолец, — можа сказаць пра яе словамі Маякоўскага: «Это было с бойцами или страной, или в сердце было моём...»

Вялікая патрыятычная ідэя — ідэя велічы Рэвалюцыі і Чалавека — знайшла ў паэме глыбокае вырашэнне ў строгай, дакладнай мастацкай форме. У ёй на ўвесь голас, шырока і ўсеабдымна загучала праўда рэвалюцыі, праўда жыцця.

Жыццё!
Я няўтольна гару тваёй прагай
пад сцягам тваім барацьбы,
пад сцягам
чырвоным...

Ад першага да апошняга радка паэма прасякнута сыноўнім клопатам пра шчасце Радзімы. Святло рэвалюцыі з яе верай у чалавека дапамаглі паэту расказаць праўду пра яе нялёгкі, але велічны лёс.

Высокі грамадзянскі напал паэмы. Лірычны герой яе расце і мужнее разам з рэвалюцыяй. Гэта і абагулены вобраз — «Яго Вялікасць Чалавек» — і ў той жа час зусім канкрэтны чалавек, наш сучаснік з уласцівымі для яго індывідуальнымі рысамі — «я ў маршчынах, сівы і губаты». З вышыні пражытых гадоў ён расказвае пра час і пра сябе. У яго простай жыццёвай мудрасці, здабытай доўгімі гадамі барацьбы, працы і роздуму, знайшоў адбітак увесь наш час.

Слухайце, людзі,
верце мне:
я ўваходжу як друг у ваш дом!

У сваёй паэме А. Русецкі здолеў паспяхова сплавіць у адзінае эпічнае і лірычнае, звярнуўшыся да традыцый М. Някрасава, Ул. Маякоўскага, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Твардоўскага. Развіццё традыцый у А. Русецкага, на маю думку, ідзе ў асноўным за кошт узмацнення лірычнага пачатку, ці, правільней, за кошт павелічэння паказу эпічных падзей праз асабістае ўспрыманне. Ці прайграе ад гэтага эпічнае? Думаецца, не. Наадварот, лірычны струмень робіць эпічнае больш інтымным, блізкім чытачу.

Мне здаецца, што характар паэмы лепш за ўсё раскрыў сам паэт у наступных радках:

Я рад, што казачных дзён святло
угледзеў у сталым веку,
дзве ж тысячы год праз мяне прайшло
змагання, дзей
чалавека.

Паэма А. Русецкага напісана на адным дыханні. Яна глыбока эмацыянальная і нагадвае сабою палымяную прамову. Інакш такая паэма і не магла быць напісана, бо аўтар прызнаецца: «Я рэвалюцыяй з маленства жыў, я дыхаў ёю...» Кожны мускул паэмы напружаны, нясе сваю нагрузку.

Такая паэма не магла не прыцягнуць да сябе ўвагу чытача. Застаецца толькі парадавацца, што наша літаратура ўзбагацілася такім творам.

Т. ЛІАКУМОВІЧ,
настаўнік.

г. Бабруйск.

І. Вейняровіч у мантажнай.

ДАРОГАЙ БЕЗ ПРЫВАЛУ

Гэта і радасна, і часам трохі горка, — маючы за плячыма ўжо нямала год, раптам убачыць на экране сяброў сваёй маладосці, зухаватых хлопцаў у самай разнастайнай партызанскай вопратцы.

Гэта не можа не ўсхваляваць нават кінадакументаліста, які шмат чаго пабачыў. Пэўна, такія пачуцці авалодалі Іосіфам Вейняровічам, калі ён аднойчы праглядваў кадры, знятыя ім у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пэўна, тады і ўзнікла ў яго думка прадоўжыць экраннае жыццё яго герояў. Імёны загінуўшых сталі здабыткам гісторыі. Але ж жывуць многія, хто іх ведаў, хто можа расказаць пра іх... Узнавіць подзвіг герояў, захаваць іх для будучых пакаленняў, даўшы ім новае жыццё на экране, — такую высакародную мэту і паставіў рэжысёр, ствараючы фільм «Дарога без прывалу».

Зараз работа І. Вейняровіча вылучана на Дзяржаўную прэмію БССР. Думаецца, гэта справядлівая адзнака ўсёй творчай дзейнасці кінадакументаліста.

Самае каштоўнае ў Вейняровіча — уменне выклікаць прыхільнасць да сваіх герояў, ствараць атмасферу давер'я і шчырасці, закранаць у душы чалавека самыя патаемныя струны, так, каб ён раскрыўся ў самым запаветным і дарагім.

Вось сінхронна зняты расказ старой маці з фільма «Дарога без прывалу» — хіба яго можна забыць? Яна плача, яна бачыць тое, аб чым гаворыць. Мінулае стаіць у яе вачах. Гэта беларуская маці, простая сялянская жанчына, прыгожая ў сваёй любві да дзяцей, у імкненні абараніць іх. І якія дужыя, адзін у адзін, выраслі яе асілкі-сыны! Аблічча маці здаецца такім родным, знаёмым, яно навявае думкі аб маці-Радзіме.

Вельмі хацелася б, каб такіх каштоўных знаходак было ў Вейняровіча больш, каб знікла нямата і іншых яго герояў, каб ржысёр больш паслядоўна праводзіў свае лепшыя творчыя прынцыпы, каб з экрана часцей гучала жывая, дакументальна запісаная гутарка, каб глядач адчуваў радасць знаёмства з цікавымі людзьмі.

Скажам, наколькі пашырыла б наша ўяўленне аб Надзеі Лісавец, гераіні вайны, яе сінхронна запісаная на плёнку мова. Як прыцягвае да сябе ўвагу яе тварразумны, валявы, энергічны, асмужаны вятрамі нялёгкіх жыццёвых шляхоў! Былы кіраўнік жаночай партызанскай групы, якая дзейнічала ў час вайны ў Францыі, Надзея Лісавец зараз чалавек адной з самых мірных прафесій — будаўнік. Лёгка, як дзяўчына, узбягае яна на будаўнічую пляцоўку — і цёпла, ласкава сустракаюць яе рабочыя, відаць, любяць яе. Партрэт нашага сучасніка, чалавека цікавага, з якім прыемна пазнаёміцца, — самае каштоўнае ў навеле пра Лісавец.

І. Вейняровіч расказаў і пра загінуўшых герояў, расказаў гэтак жа ярка, як пра жывых. Адзін з самых лепшых эпізодаў «Дарогі без прывалу» поўны трагічнай, вострай праўды, — эпізод пра лётчыка Сашу Мамкіна, які вывез на самалёце 186 дзяцей, асуджаных фашыстамі на ролю донараў для сваіх салдат. Аб гэтым расказвае былая выхавальніца дзяцей, якая разам з імі ляцела ў самалёце. Кадры тых часоў робяць незабыўнае ўражанне. Мы чуем узрушаны голас жанчыны, перад вачыма якой усё жыццё стаіць сцэна подзвігу А. Мамкіна, і бачым на экране маленькіх, у лахманах, хлопчыкаў і дзяўчынак, якіх асцярожна і пяшчотна перадаюць з рук у рукі і саджаюць у самалёт. Цяпер гэтыя дзеці маюць сваіх дзяцей, і ім расказваюць яны пра свайго збавіцеля Сашу Мамкіна, які захаваў ім жыццё, заплаціўшы за гэта сваім.

На жаль, размова аб сённяшнім дні герояў вядзецца скорагаворкай, і гэтае месца фільма менш запамінаецца. Можна толькі здагадвацца аб характарах і духоўным абліччы людзей, на экране яны з'яўляюцца часам нямымі статыстамі, якія завучана пазіруюць пад дыктарскі тэкст. Тут Вейняровіч выступае супраць Вейняровіча.

Але гэта, як кажуць, дробныя пралікі. Фільм «Дарога без прывалу» атрымаўся змястоўны, эмацыянальны. Нашчадкі будуць удзячныя кінематаграфісту за партрэты нашых сучаснікаў, за захаванне і аднаўленне непаўторных вобразаў герояў Вялікай Айчыннай вайны.

Дарогай без прывалу ідзе радавы вялікай арміі савецкіх кінадакументалістаў І. Вейняровіч. І ў час вайны і цяпер камера — яго зброя. Наперадзе новыя шляхі, можа і няўдачы, але ж лёгка дыхаецца толькі пасля адоленай вяршыні. Адной з такіх творчых вяршынь і з'яўляецца фільм «Дарога без прывалу»

В. НЯЧАЙ.

АДНА З ЛЕПШЫХ

Я даўно сачу за творчасцю Міхася Савіцкага і помню ўсе яго палотны, якія давялося ўбачыць на мастацкіх выстаўках: ад «Песні» да карціны «Рыта і Андрэй».

Аднойчы ўбачаныя, палотны М. Савіцкага хвалююць. Час ад часу яны паўстаюць перад унутраным зрокам, прымушаюць думаць, разважаць, асэнсоўваць бачанае, дапамагаюць па аналогіі глыбей пазнаваць неўсвядомленае ў жыцці і ў мастацтве. Яны нясуць вялікі зарад энергіі і адзнаку своеасаблівасці мастацкага бачання свету.

Карціна «Партызаны» — сплаў філасофскай і мастацкай глыбіні. Гэта твор глыбока патрыятычны і нацыянальны.

Звярніце ўвагу на мужчыну і жанчыну. Паставa фігур, адзенне, клумкі за плячыма — усё гэта беларускае, роднае. Усе дэталі трапна падмечаны мастаком у жыцці.

Амаль чвэрць стагоддзя мінула пасля заканчэння вайны. За гэты час напісана шмат твораў на партызанскую тэму. І сярод іх адна з лепшых карцін — «Партызаны» Міхася Савіцкага.

Некалькі слоў пра скульптуру Аляксея Глебава «Юнацтва». Яна выканана бездакорна, па-майстэрску. Паставай фігуры, усім вобразным ладам скульптар перадаў летуценнасць і чысціню, рамантызм і ўзнёсласць, так уласцівыя маладосці. Але мне здаецца, што мастак не здолеў глыбока пранікнуць у душэўны стан сваёй гераіні. Вонкавая прыгажосць тут пераважае, увага гледача засяроджваецца не на ўспрыманні і аналізе нейкіх унутраных маральных і псіхалагічных вартасцей вобраза, а на чыста знешніх момантах. Таму скульптура не набывае значнага грамадскага гучання.

Н. КЕДАЛАВА,
журналістка.

РОЗДУМ АБ МАЙСТЭРСТВЕ

Сярод твораў, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР у галіне літаратуры, названа і кніга Рыгора Шкрабы «Характар, стыль, дэталь». Яна — сур'ёзны роздум даследчыка аб лепшых творах нашай літаратуры, спроба заглянуць у творчую лабараторыю такіх майстроў мастацкага слова, як Я. Колас, К. Чорны, Я. Брыль, І. Мележ, А. Кулакоўскі. На канкрэтных прыкладах даследчык паказвае, як праз мастацкі стыль пісьменнік выяўляе сваю самабытнасць, арыгінальнасць. І, урэшце-рэшт, у гэтай кнізе — шчырая заклапочанасць пра сучасны стан нашай літаратуры і яе першаэлемент — мову, якая з'яўляецца і матэрыялам, і інструментам, пры дапамозе якога пісьменнік выказвае свае думкі, свае адносіны да чалавека, да грамадства.

Кніга насычана багатым фактычным матэрыялам, яна прымушае думаць, хваляваццa, спрачацца. Бо, як адзначыў сам аўтар, «мусіць, няма нічога больш сумнага, чым крытычная кніга ці літаратуразнаўчая манаграфія, якія не выклікаюць роздуму, не падбіваюць на спрэчку, не абуджаюць жадання хоць бы прачытаць твор, пра які ідзе гаворка». Хочацца сказаць адразу, што гэтай сумоты, слоўнай цягучкі не сустрэнеш у кнізе Р. Шкрабы.

Адкрываецца кніга змястоўным артыкулам аб рамане І. Мележа «Людзі на балоце». Даследчык грунтоўна аналізуе гэты выдатны твор як з ідэйнага, так і з мастацкага боку, дае сціслую, аб'ектыўную характарыстыку вобразаў. Шмат увагі ў артыкуле ўдзяляецца даследаванню мастацкіх сродкаў, якімі карыстаецца Мележ, пластыцы мовы твора, уменню пісьменніка дэталёва абмалёўваць герояў, іх характары.

У І. Мележа што ні вобраз, то свой адметны характар. Іменна ў абмалёўцы людзей, іх псіхалогіі, як справядліва заўважае Р. Шкраба, найбольшая ўдача пісьменніка. І менавіта таму вобразы яго рамана застаюцца ў памяці. Гэта ў першую чаргу датычыць Васіля, Ганны, Глушака, Апейкі, Міканора і многіх іншых.

Шмат думак, разваг выклікаюць артыкулы «Дэталь і характар», «Слова і стыль». На шматлікіх прыкладах з твораў нашых майстроў аўтар паказвае, як часам адно слова, адна трапная дэталь характарызуюць усяго героя, і як гэта важна для пісьменніка ўмець знайсці гэтае адзінае слова, гэтую «гаворачую» дэталь. Лепшыя пісьменнікі тонка і разам з тым кожны па-свайму адчуваюць слова, умеюць карыстацца і дыялогам, і маналогам, і пейзажам. Мастаку слова, калі ён сапраўды хоча стаць удумлівым даследчыкам чалавека, неабходна карпатліва, штодзённа вучыцца ў народа, ведаць яго жыццё, яго мову, яго быт, яго гісторыю. Без ведання мовы не можа быць і гаворкі аб майстэрстве, бо, паводле справядлівага выказвання К. Чорнага, «мова — жывая істота. Яна жыве, а не існуе. Адным словам можна вельмі шмат выказаць або тым жа самым словам нічога не сказаць».

Мова дае нам права меркаваць пра мастацкі густ пісьменніка, яго стыль, пра веданне ім жыцця. Гаворачы аб мове і стылі, Р. Шкраба спасылаецца на трылогію Я. Коласа «На ростанях», адзначае яе высокую мастацкасць, глыбокую праўдзівасць, незвычайную прастату, гаворыць пра высокую культуру псіхалагічнага аналізу ў гэтым творы, пра спалучэнне ў ім трагічнага і камічнага, пра майстэрскае карыстанне няўласна-простай мовы, дыялогам, унутраным маналогам і г. д.

Артыкулы Р. Шкрабы аб дэталі, характары, мове і стылі — глыбокае даследаванне такога важнага і скаданага пытання, як пісьменніцкае майстэрства. Гэта цікавая пазнавальная лекцыя, прачытаная вопытным выкладчыкам для маладых пісьменнікаў.

Адметная рыса Р. Шкрабы як крытыка, даследчыка — гэта ўменне радавацца свежай, новай думцы, выказанай таварышам. У творчасці пісьменніка ён імкнецца заўважыць і падтрымаць перш за ўсё добрае, станоўчае, тактоўна, аргументавана паказаць недахопы, пралікі, калі яны ёсць. Якраз аб гэтым сведчаць яго артыкулы «Кнігу прачытаў крытык», «У пошуках ісціны», «Мова пісьменніка», «Сваё, запаветнае», «Праз многа год».

Са шчырай радасцю ён гаворыць пра А. Адамовіча, які па-новаму, глыбока прачытаў коласаўскую «Новую зямлю», і пра Р. Бярозкіна, які першы сказаў праўдзівае слова аб паэме З. Астапенкі «Эдэм» у артыкуле «Выпрабаванне часам». І разам з тым Р. Шкраба сур'ёзна і доказна спрачаецца з А. Кучарам, які не здолеў належным чынам ацаніць многія творы Я. Брыля.

Як дбалы, удумлівы і руплівы гаспадар, глядзіць Р. Шкраба на нашу літаратурную ніву, зацікаўлена непакоіцца аб яе ўраджаі. Такое ўражанне застаецца ад кнігі «Характар, стыль, дэталь».

М. БАЗАРЭВІЧ.

НАСУСТРАЧ НОВАМУ ЖЫЦЦЮ

У апошнія гады ў нашай літаратуры бурна развіваецца сацыяльна-гістарычны раман. Гэта адзнака сапраўднай сталасці нашай літаратуры, сведчанне яе вялікіх магчымасцей. Сярод твораў на сацыяльна-гістарычную тэматыку прыкметнае месца заняў раман-хроніка Аркадзя Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка», дзеянне якога разгортваецца напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1905—1907 гадоў. Кожнаму, хто прачытаў раман (а выйшлі ўжо дзве кнігі яго), думаю, прыемна і радасна было ўбачыць гэты твор у ліку вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі.

Сваю ўвагу пісьменнік засяродзіў на невялічкім кавалачку жыццёвай прасторы — засценку Малінаўка. Але і гэтага невялікага засценка на Палессі, закінутага ўбок ад вялікіх дарог і гарадоў, яму хапіла, каб глыбока паказаць паслядоўнае выспяванне рэвалюцыйных ідэй у свядомасці прыніжаных спрадвечным прыгнётам людзей.

Цэлая галерэя цікавых і, не пабаюся сказаць, надзвычай яркіх чалавечых характараў праходзіць перад чытачом. Тут удзельнікі сацыял-дэмакратычнага гуртка — рабочы Якаў Шэмет, парабкі Станіслаў Вярбіцкі, Павел Квітун, Платон Шабуня, бядняк Юрка Хмялеўскі, браты Шымкевічы і мясцовыя багацеі — кулак Яўхім Халуста, млынар Хаім Ножык, аканом Гендарсан, ураднік Бераговуські.

Адным з самых удалых у рамане, на маю думку, з'яўляецца вобраз Якава Шэмета, кіраўніка сацыял-дэмакратычнай групы. Гэта цікавы чалавек, добры арганізатар. Ён не толькі ўскалыхнуў застаялую твань жыцця малінаўцаў, але змог сабраць вакол сябе беднякоў, арганізаваць іх на барацьбу са сквапным і хітрым Яўхімам Халустам. За яго плячыма немалы вопыт рэвалюцыйнай барацьбы ў горадзе. Ён бачыў гарадскіх халуставў, добра ведаў іх звярынае нутро, ведаў, як з імі трэба змагацца. І хоць ён сам вырваны са «свайго», рабочага асяроддзя і ў вёсцы адчуває сябе крыху «не ў сваёй талерцы», мы бачым жывога, разумнага, спагадлівага чалавека, якому заўсёды можна даверыцца.

Добрыя сімпатыі выклікае і засцянковы шляхціц Андрэй Сташэвіч. Аўтар удала паказаў нялёгкую дарогу яго — ад пасіўнай сузіральнасці да разумення несправядлівасці існуючага ладу.

З вобразаў, што стаяць на другі бок барыкады, хацелася б адзначыць Халусту. Гэта тыповы вобраз вясковага багацея — грубага, жорсткага, хціваго, які дзеля нажывы гатовы пайсці на любы ўчынак, на любое злачынства.

Падзеі рамана адбываюцца ў час, аддзелены ад нас адлегласцю больш чым паўвекавой даўнасці. Але чытаеш твор — і адчуваеш атмасферу сучаснасці яго. Аркадзь Чарнышэвіч вельмі добра ведае вясковы побыт, сялянскую псіхалогію, герояў яго — жывыя, цікавыя людзі. І галоўнае, за іх даўнімі штодзённымі трывогамі і клопатамі ясна ўгадваюцца сённяшнія трывогі і клопаты пісьменніка аб людзях, аб іх шчасці.

Падзеі другой кнігі рамана-хронікі абрываюцца напярэдадні 1905 года. Насустрач рэвалюцыі ідуць героі рамана. Яны яшчэ павінны змагацца, павінны сустрэць рэвалюцыйную буру, прынесці ёй свае маладыя, чыстыя, высакародныя сэрцы. Я веру ў іх, веру ў іх справы і думы, бо Аркадзь Чарнышэвіч паказаў мне іх глыбока і ўсебакова.

А. ЗАЛЕЎСКІ,
журналіст.

СТАЛАСЦЬ

У СПІСЕ твораў, вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР, названы Другая і Трэцяя сімфоніі Яўгена Глебава. Гэта сведчыць перш за ўсё пра сталасць беларускай музычнай культуры, якая мае такія маштабныя творы высокага ідэйнага гучання, пра росквіт творчасці самога Яўгена Глебава, кампазітара яркага і таленавітага.

Аднак перш чым гаварыць пра сімфоніі Глебава, хачу спыніцца на пытанні, якое ўзнялі М. Губернатараў і С. Законнікаў у артыкуле «Пазнаёміўшыся са спісам прэтэндэнтаў...» («Літаратура і мастацтва» ад 27 мая г. г.). Аўтары адзначаюць наступную супярэчнасць. У паведамленні аб парадку прысуджэння прэмій, апублікаваным у газетах, гаворыцца, што першае прысуджэнне Дзяржаўных прэмій БССР «будзе праведзена за творы і работы, створаныя ў 1965 годзе», між тым, у спісе твораў прэтэндэнтаў на прэмію ёсць нямала такіх, якія былі створаны да 1965 года.

Фармальна М. Губернатараў і С. Законнікаў маюць рацыю. Але разбяром пытанне па сутнасці. Калі прэмія штогадовая, дык яна сапраўды павінна прысуджацца за творы, створаныя ў перыяд аднаго года. Але ж у гэтым годзе Дзяржаўныя прэміі БССР будуць прысуджацца ўпершыню. Якія могуць быць пераканаўчыя матывы, каб за добрую сімфонію, створаную ў 1964 або 1962 годзе, прэміі не прысуджаць? Якія перавагі ў сімфоніі 1965 года перад сімфоніяй 1963 года? Толькі тыя, што тады прэмій не было, а цяпер яны ўстаноўлены. Гэта перавага, якая ніяк не звязана з ідэйна-мастацкімі якасцямі твора, а значыць, і неістотная.

Тут ёсць і пераканаўчы прэцэдэнт. Калі ў 1957 годзе было адноўлена прысуджэнне Ленінскіх прэмій, дык у першым спісе лаўрэатаў мы з задавальненнем прачыталі імя Сяргея Пракоф'ева, якому прэмія была прысуджана пасмяротна за Сёмую сімфонію, створаную ў 1952 годзе. І гэта не толькі не выклікала ніякага пярэчання, а было ўспрынята музычнай грамадскасцю з вялікім задавальненнем, як рашэнне лагічнае і абгрунтаванае.

Дзяржаўныя прэміі БССР павінны прысуджацца ў наступныя гады за рэчы, створаныя ў адным каляндарным годзе. А сёлета ёсць усе падставы абмяркоўваць работы не толькі 1965 года, але і тыя, што створаны ў апошнія некалькі гадоў. Гэта паняцце — «апошнія некалькі гадоў», праўда, вельмі неакрэсленае. Але і тут можна знайсці некаторыя больш дакладныя крытэрыі. Было б, скажам, дзіўна, калі б на Дзяржаўныя прэміі БССР цяпер вылучалі сімфанэту «Беларускія карцінкі» Чуркіна (1925 г.) або Беларускую сюіту Туранкова (1933 г.). Гэтыя добрыя творы адыгралі сваю значную ролю ў развіцці беларускай сімфанічнай музыкі, але цяпер яны ўжо належаць гісторыі. Між тым, Другая і Трэцяя сімфоніі Глебава, створаныя ў 1963 і 1964 гадах, — гэта творы сённяшнія. Іх прэм'еры яшчэ свежыя ў нашай памяці. Шматлікія выкананні сімфоній у гарадах Беларусі, Крыма, Урала, Сібіры, Узбекістана (якраз у гэтыя два-тры гады) толькі пацвердзілі высокую вартасць твораў. Таму іменна сёння можна ўжо вынесці абгрунтаванае рашэнне аб іх.

Мне здаецца, што ўпершыню Дзяржаўныя прэміі БССР могуць быць прысуджаны за работы, створаныя за апошнія пяць гадоў. Галоўным крытэрыем пры вырашэнні пытання аб «тэрмінах даўнасці» павінна быць наступнае: ці працягвае заставацца дадзены твор актуальным у цяперашняй, штодзённай практыцы, ці не страціў ён свежасці, ці па-ранейшаму знаходзіцца ў цэнтры падзей.

Цяпер пра Другую і Трэцюю сімфоніі Яўгена Глебава. Ім папярэднічала Першая сімфонія, «Партызанская» (1958 г.), якая заслугоўвае некалькіх слоў. Мне прыгадваецца дасціпная заўвага аднаго нямецкага музыказнаўцы: кожны нямецкі кампазітар лічыць справаю гонару напісаць «вялікую сімфонію ў до мажоры». Перафразуючы, мы можам сказаць: кожны малады кампазітар хоча напісаць сімфонію і гэтым нібы здаць экзамен на «атэстат сталасці». Але практыка апошніх гадоў трошкі трывожыць: у сімфоніях маладых няма маладосці; пераважаюць вобразы наўмысна складаныя. Быццам маладыя кампазітары хутчэй хочуць паказаць, што яны ўжо сталыя мастакі, здольныя ўвасобіць вельмі складаныя калізіі. Аднак мастацкая сталасць прыходзіць з гадамі, па меры накаплення жыццёвага і творчага вопыту. Таму «сур'ёзнасць і глыбіня» сімфоній маладых кампазітараў нярэдка ператвараецца ў наўмысную разумовасць. У якасці прыкладу спашлюся на першыя сімфоніі маладых беларускіх кампазітараў Р. Буцвілоўскага і Д. Смольскага. Або вось зусім свежы прыклад. На нядаўнім канцэрце ў кансерваторыі была выканана першая частка сімфоніі студэнта Ф. Пыталева, у якой быў той жа падтэкст: «як важна быць сур'ёзным».

Нешта падобнае адбылося і з Першай сімфоніяй Глебава. Яе праграма вызначана ў загалоўку «Партызанская». Гэта тэма надзвычай актуальная для беларускай музыкі. Але для Глебава яна была ў пэўнай ступені абстрактнай. Зноў толькі жаданне напісаць сур'ёзную сімфонію. Талент кампазітара адчуваўся і тут, але не было яшчэ сталасці сімфанічнай канцэпцыі.

Пасля Першай сімфоніі Глебаў пяць гадоў не звяртаўся да гэтага жанру, што магло здацца дзіўным. Кампазітар валодае формай сімфоніі і фарбамі сімфанічнага аркестра, цягнецца да сімфанічных жанраў, меў ужо ў іх поспех — трэба пісаць другую сімфонію! Але пяцігадовую паўзу можна, мне думаецца, растлумачыць. Глебаў — кампазітар разумны, які добра адчувае, што ў яго атрымалася, а што — не зусім. Ён, напэўна, адчуў, што сімфонія можа нарадзіцца толькі тады, калі яна ў кампазітара ўнутрана выспее. А гэта прыходзіць не адразу. Сам Глебаў гаворыць, што ўсе гады пасля Першай сімфоніі думаў пра новую, але... задумы і роздум не ператвараліся ў рэальную плоць.

У пяцігоддзе паміж дзвюма сімфоніямі Глебаў стварыў два буйныя творы: балет «Мара» і оперу «Твая вясна». Абодва творы сучасныя па тэме і «маладзёжныя» па зместу. Пасля завяршэння оперы «Твая вясна», якая расказвае пра жыццё савецкай моладзі, кампазітару захацелася, па яго словах, «і ў сімфоніі ўславіць юнацтва: з'явіліся тэмы, з'явілася структура, склалася канцэпцыя». Так узнікла Другая сімфонія, створаная кампазітарам надзвычай хутка, нібы на адным творчым парыве.

Гэта сапраўды «маладзёжная сімфонія» — яна поўная святла, жыцця, руху. Але гэта не бяздумная маладосць. Мне ўяўляецца, што Другая сімфонія Глебава апавядае пра багаты і складаны душэўны свет сучаснага савецкага чалавека, яшчэ маладога, але які ўжо ставіць перад сабой складаныя жыццёвыя задачы, цяжкія філасофскія праблемы. Яму ўласцівыя супярэчнасці і канфлікты, але пераважае радаснае адчуванне паўнаты жыцця, перамагае здаровае і яснае светаўспрыняцце.

Музыка Другой сімфоніі вельмі добрая. Мова яе свежая і сучасная. У ёй ёсць і вострыя рытмы, і складаныя гармоніі, але ёсць таксама прастата, натуральнасць і, што асабліва вабіць, сапраўдная меладычнасць. Асноўныя тэмы першай і другой частак, адна з напеўных тэм фіналу — гэта цудоўныя мелодыі, поўныя шчырых і высакародных пачуццяў. Яны прыгожыя і тым, што Глебаў вельмі ўмела і тактоўна, вельмі арганічна ўключае ў іх характэрныя папеўкі беларускіх народных песень. Кампазітар дасціпна шукае і знаходзіць новыя прынцыпы творчага выкарыстання фальклору.

Другая сімфонія вызначаецца дакладнасцю канструктыўнай задумы і стройнасцю формы. Кампазітар праявіў багацце фантазіі і вялікае тэхнічнае майстэрства ў ператварэнні і развіцці тэм; скразная сімфанічная драматургія твора Глебаву несумненна ўдалася. Пры гэтым сама тэхналогія нідзе не з'яўляецца самамэтаю, не выпірае на паверхню, а схавана ўглыбіні, падпарадкавана задачам музычнай вобразнасці і выразнасці.

Калі Другую сімфонію ад Першай падзяляюць пяць гадоў, дык Трэцюю ад Другой — усяго адзін год. Яны створаны непасрэдна адна за другой. Многае іх звязвае, абедзве яны ляжаць у рэчышчы лірыка-драматычнага сімфанізму, але і многае адрозніваеі: калі ў Другой быў акцэнт на лірыцы, дык у Трэцяй — на драматызме. Юнак зрабіўся сталым мужам — так можна, вядома, вельмі ўмоўна, вызначыць рух ад Другой сімфоніі да Трэцяй. Звяртае на сябе ўвагу яе другая частка, поўная стрыманых, глыбокіх, часам сумных пачуццяў. Так прыйшла ў сімфонію філасофская глыбіня — не тая, наўмысная, якая выклікае ўсмешку ў «сімфоніях маладых кампазітараў», а сапраўдная, якая сведчыць пра творчую сталасць, што прыйшла да кампазітара, пра тое, што ён здольны па-філасофску асэнсаваць з'явы рэчаіснасці. Для сімфоніі — жанру, найбольш абагульненага, — гэта вельмі важна.

Існуе нейкая грань, за якой проста музыка становіцца Музыкаю з вялікай літары, проста сімфонія, як чарговая навінка, не больш, становіцца Сімфоніяй з вялікай літары, рэдкай і жаданай з'явай, якая пакідае прыкметны след у развіцці мастацтва. Я глыбока перакананы, што Другая і Трэцяя сімфоніі Глебава знаходзяцца за гэтай гранню. Яны сталі вялікай і радаснай падзеяй сённяшняга этапу развіцця беларускай музыкі.

Леў АЎЭРБАХ.

СМЕЛАСЦЬ ТЭАТРА

Тэатр Ляонава...

Тэатр, у рэпертуары якога трынаццаць п'ес.

Лёс адной з іх склаўся цяжка: напісаная ў саракавым годзе і нават пастаўленая, яна была беспадстаўна раскрытыкавана, знята з рэпертуару.

Але сёння можна гаварыць пра трынаццаць п'ес Ляонава — п'еса «Мяцеліца» вярнулася на падмосткі сцэны.

У Ляонава ж права на свой тэатр не могуць адабраць ні цынікі, ні скептыкі.

Станіслаўскі неяк сказаў, што для ідэальнага чалавецтва тэатр будзе служыць кнігаю жыцця, таксама як раней ён быў ключом да жыцця, а яшчэ раней — толькі забаваю...

Не будзе вялікім перабольшаннем сказаць, што драматургія Ляонава як бы прадугадвае тэатр светлай будучыні, які стане для гледача настольнай кнігай жыцця.

Сам Ляонаў так гаворыць пра задачы нашай драматургіі: «Сёння ў драматургіі патрэбны перш за ўсё мысліцелі, якіх наша краіна высылае наперад калі не разведаць і нанесці на карты сцяжынкі ў будучыню, дык хоць бы расказаць у паэтычных вобразах пра само аблічча яе. Гэтым вызначаецца кола тэм і думак драматурга, калі ён хоча аказацца зусім сучасным і, значыць, патрэбным нашаму грамадству».

Драматургія Ляонава — гэта паўстагадовая гісторыя нашага грамадства, паданая ў паэтычных, абагуленых да сімвалаў вобразах.

«Мяцеліца» — мужнае і сумленнае апавяданне пра самы драматычны перыяд нашай гісторыі. Час духоўнага выспявання і станаўлення савецкага чалавека. Час, які адштурхоўваў сваёй складанасцю і драматызмам маладушных мастакоў. Ці не таму сучасныя тэатры, як кажуць, «са скрыпам» бяруцца за пастаноўку п'ес Ляонава? Гэтыя п'есы прымушаюць мысліць не толькі гледача, але і акцёра, рэжысёра, усіх стваральнікаў ляонаўскіх спектакляў. А чаго грахі таіць, распешчаны прымітыўнай, аблегчанай драматургіяй «модных» драматургаў, сучасны тэатр часта выбірае шляхі больш «пратаптаныя» і лягчэйшыя, падмяняючы думку, грамадзянскую шчырасць, сур'ёзнасць праблем у адных выпадках рамесніцтвам, у другіх — збітымі штампамі. Гэта, вядома, бяспечна, бо праверана і стала прывычным. Гэта лёгка таму, што размова з гледачом ідзе павярхоўная, з віртуозным увільваннем ад адказаў і спрытным абыходам вострых вуглоў. Падобная драматургія, а следам і тэатр па сутнасці адрасуецца да пошлага густу абывацеля ў спадзяванні на поспех у яго. І тэатр разам з драматургам часта знаходзіць гэты поспех і нават аб'яўляе яго творчай перамогай. А абывацель, які баіцца, як агню, пякучых пытанняў сучаснасці, патрабуе ад тэатра толькі забавы, касай падтрымлівае гэтую свядомую здраду тэатра праўдзе жыцця.

Спектакль Тэатра імя Янкі Купалы «У мяцеліцу» — не для абывацеля. У гэтым яго грамадзянская і эстэтычная каштоўнасць.

Сустрэча з драматургіяй Ляонава аказалася плённай і павучальнай для стваральнікаў спектакля «У мяцеліцу»: і для пастаноўшчыка Барыса Эрына, і для мастака А. Грыгар'янца, і для выканаўцаў.

Пра двух выканаўцаў хочацца гаварыць у першую чаргу. Гэта — Л. Рахленка, выканаўца ролі Сцяпана Сыраварава, і Л. Ржэцкая — Марфа... Гэта сапраўды ляонаўскія вобразы. А што такое ляонаўскія вобразы? Гэта людзі моцных пачуццяў і высокага інтэлекту ва ўсіх выпадках — і тады, калі яны добрыя, светлыя і пранікнёныя, як Марфа, і тады, калі ў іх страшныя, загніўшыя душы, як у Сыраварава. Сілам дабра даводзіцца змагацца ў п'есах Ляонава (у тым ліку і ў спектаклі «У мяцеліцу») з моцным і небяспечным ворагам — тут не памагаюць ніякая бутафорыя, апроч сапраўднага пераўвасаблення і пранікнення ва ўнутраны свет вобраза і дакладнага рэжысёрскага прачытання п'есы, што і ўдалося Б. Эрыну.

Л. Рахленка не толькі «па-акцёрску» пранік у задуму Ляонава, але і дапоўніў вобраз Сыраварава, узбагаціў яго асабістым веданнем падобных натур. Ён не пасіўна, не натуралістычна лепіць аблічча Сыраварава, а мэтаімкнённа і лагічна выкрывае яго з усёй сваёй грамадзянскай палымянасцю і асабістай непрымірымасцю да падобных людзей. Гэта пазіцыя акцёра-грамадзяніна. У гэтым сакрэт поспеху Л. Рахленкі.

Роля Марфы ў выкананні Л. Ржэцкай — прынцыповая творчая перамога таленавітай беларускай актрысы, якая ў апошні час, калі так можна сказаць, «зачахла» ў спектаклях па модных п'есах, дзе пафас нашага жыцця, яго складанасць і непаўторнасць падмяняецца свавольствам перарослых абібокаў, а надзённыя праблемы часу — нікчэмным бурчаннем і беспрадметнымі пошукамі «месца ў жыцці», якое ўяўляецца гэтакім ціхім, утульным мяшчанскім раем, агароджаным банальнымі ісцінамі ад магутных вятроў эпохі.

Сваёй Марфай Л. Ржэцкая вяртае на беларускую акадэмічную сцэну сапраўднага героя сучаснасці ва ўсёй яго велічы і ўсведамленні свайго гістарычнага абавязку перад чалавецтвам.

Гэта вельмі важна. Гэта — варта прызнання.

Пятро ВАСІЛЕЎСКІ.

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА ТВОРЫ, ВЫЛУЧАНЫЯ НА ПРЭМІЮ

СПЕКТАКЛЬ ТЭАТРА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ «У МЯЦЕЛІЦУ».

Т. Арлова. Працяг традыцыі. «Советская Белоруссия», 7 снежня 1965 г.

Л. Брандабоўская. Пра чэсных і гордых. «Знамя юности», 5 снежня 1965 г.

А. Бутакоў. Да святла, да праўды! «Літаратура і мастацтва», 30 лістапада 1965 г.

Ю. Зубкоў. Нельга жыць без Радзімы. «Литературная газета», 25 снежня 1965 г.

Ул. Няфёд. Прынцыповы поспех тэатра. «Звязда», 16 снежня 1965 г.

**ХРАНІКАЛЬНА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫ ФІЛЬМ «ДАРОГА БЕЗ ПР

ГРАМАДСКІ АГЛЯД

БІБЛІЯТЭК

ПРАБЛЕМА НАДЗЁННАЯ, АЛЕ...

Як зацікавіць дарослага і школьніка кнігай, як дамагчыся, каб прачытаная кніга прыносіла чалавеку найбольш карысці і душэўнай асалоды, — усё гэта трывожыць сельскага прапагандыста літаратуры.

Нялёгка справіцца з гэтымі абавязкамі нават добра падрыхтаванаму спецыялісту. Большасць жа сельскіх бібліятэкараў маюць толькі агульную сярэднюю адукацыю, небагаты вопыт работы. Акрамя гэтага, бібліятэкар вельмі часта бывае загружаны іншымі справамі, не менш складанымі, чым работа з кнігай: арганізацыяй гурткоў мастацкай самадзейнасці, правядзеннем рэпетыцый, падрыхтоўкай канцэртных праграм і інш.

Усё часцей у практыцы аддзелаў культуры назіраецца схільнасць падыходзіць з аднолькавай меркай да ацэнкі працы і сельскай бібліятэкі і сельскага клуба, не ўлічваючы спецыфікі іх работы. Хіба можна мірыцца, калі сельскага бібліятэкара лічаць перадавым у раёне толькі таму, што ён прывёз на раённы агляд самадзейнасці лепшы харавы гурток? Прыклад такой недарэчнасці — Астровенская сельская бібліятэка Бешанковіцкага раёна, якую заўсёды за гэта адзначалі як лепшую. А яе загадчыца т. Бараноўская зусім не займаецца прапагандай кнігі, не ведае ні навінак, ні нават назваў кніг, адзначаных Ленінскай прэміяй. Падобных прыкладаў нямала.

На працягу апошніх год органы культуры займаліся пытаннем правільнай арганізацыі і размяшчэння бібліятэк па сельсаветах з разлікам, каб у кожным з іх былі бібліятэка і клуб. Аднак гэту работу можна лічыць фармальнай да таго часу, пакуль у рэспубліцы не будзе вырашана праблема спецыялізацыі бібліятэчнай і клубнай працы, пакуль бібліятэкі будуць у аднолькавай меры адказваць перад органамі культуры за арганізацыю самадзейнасці як за работу з кнігай, а клубы — за бібліятэчную работу.

Неабходнасць такой спецыялізацыі абгрунтоўваецца яшчэ і тым, што ні адна навучальная ўстанова: ні бібліятэчны факультэт педінстытута, ні бібліятэчны тэхнікум, ні культасветвучылішча пакуль што не рыхтуюць такіх спецыялістаў культасветработы шырокага профілю, якія маглі б весці на належным узроўні і бібліятэчную і клубную работу. Акрамя таго, фізічна немагчыма аднаму работніку справіцца з гэтымі задачамі.

Дарэчы, у Расійскай Федэрацыі і на Украіне ўжо некалькі год сельскія бібліятэкі займаюцца толькі бібліятэчнай работай, а клубы арганізуюць работу мастацкай самадзейнасці, займаюцца арганізацыяй культурнага адпачынку на ўсёй тэрыторыі сельсавета, перадаўшы кніжны фонд сельскім бібліятэкам. Населеныя пункты абслугоўваюцца кнігай або праз абанементы, або пунктамі выдачы і перасоўкамі. Усё гэта прадугледжана асобнымі палажэннямі аб сельскай бібліятэцы і сельскім клубе. Толькі такое размеркаванне працы будзе садзейнічаць павышэнню адказнасці культасветработнікаў за даручаную справу, паляпшэнню як бібліятэчнай, так і клубнай работы. Вядома, што гэта не перашкодзіць лепшым бібліятэкарам — аматарам мастацкай самадзейнасці — удзельнічаць і дапамагаць работнікам клубаў, а загадчыкам клубаў — быць актывістамі бібліятэкі, уносіць свой уклад у прапаганду кнігі. Перад бібліятэкамі і клубамі ставіцца адна важная задача — павышэнне культуры насельніцтва. Але сродкі і метады вырашэння гэтай задачы, безумоўна, павінны быць рознымі для бібліятэкі і клуба.

Загадчык метадычнага аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна В. Арцем'еў у сваім артыкуле «Праблема — бюджэт часу» (газета «Літаратура і мастацтва» ад 6 мая г. г.) піша, што абслугоўванне дзяцей з'яўляецца перашкодай для дзейнасці сельскага бібліятэкара, што ў яго адарвалі значную частку рабочага часу і прымусілі рабіць тое, што павінна была б рабіць школьная бібліятэка. З гэтым пагадзіцца ніяк нельга. Цяпер ідзе ўсесаюзны агляд бібліятэк, адной з важнейшых умоў якога з'яўляецца дыферэнцыраванае абслугоўванне моладзі, падлеткаў і дзяцей шляхам арганізацыі юнацкіх бібліятэк, дзіцячых аддзяленняў пры сельскіх бібліятэках. І добра робяць тыя сельскія бібліятэкі, якія адкрываюць дзіцячыя аддзяленні, пакоі юных чытачоў, шырока выкарыстоўваючы ўдзел грамадскасці і актыву. Дзякуючы гэтаму за апошні час у рэспубліцы значна палепшылася бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей на вёсцы. Летась былі адкрыты 154 дзіцячыя пакоі. Цяпер толькі ў Віцебскай вобласці пры сельскіх бібліятэках працуюць 42 пакоі, 574 дзіцячыя аддзяленні і куткі юнага чытача, у 660 сельскіх бібліятэках аб работе з дзецьмі клапоцяцца грамадскія намеснікі загадчыкаў. У гэтым годзе навукова-метадычны аддзел Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна выдаў зборнік матэрыялаў з вопыту гэтай работы «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей на сяле». Многія сельскія бібліятэкі працуюць у цесным кантакце са школьнымі, не дублююць, а дапаўняюць іх работу.

Павышаючы ролю сельскіх бібліятэк у камуністычным выхаванні дзяцей, трэба мець на ўвазе яшчэ і тое, што школьныя бібліятэкі на вёсцы, за выключэннем дзвюх-трох у раёне, не маюць штатных работнікаў, а адказнасць за кніжны фонд і выдачу на грамадскіх асновах часта нясуць настаўнікі, перагружаныя асноўнай работай. І зусім няправільна было б ускласці на іх поўную адказнасць за выхаванне культуры чытання, арганізацыю сістэматычнай індывідуальнай работы з юным чытачом, масавую і наглядную прапаганду кнігі сярод школьнікаў. Нельга адрываць выхаваўчую работу сярод дарослых ад выхавання дзяцей. Ці не таму яшчэ і цяпер так цяжка прыхаводзіць да карыстання бібліятэкай некаторых дарослых людзей, што ў гады іх дзяцінства было значна менш магчымасцей прывіць ім любоў да кнігі. Цяпер мы маем усе ўмовы для выкарыстання кнігі ў камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення. Ні адна сельская бібліятэка не павінна быць убаку ад гэтай важнай справы.

В. Арцем'еў непрынцыпова падышоў да абмеркавання гэтай праблемы, абвінаваціўшы сваіх калег з абласной дзіцячай бібліятэкі ў тым, што яны «ўкралі» ў сельскага бібліятэкара 10—15 рабочых мінут штодзённа на ўлік работы з чытачамі да 16 год. Неабходнасць жа ўліку работы з дарослымі і з дзецьмі рэкамендавана практычным дапаможнікам. «Работа з дзецьмі ў сельскай бібліятэцы» (выдавецтва «Кніга», 1965 г.). Гэта рэкамендацыя грунтуецца на глыбокім аналізе работы бібліятэк. Кожны сельскі бібліятэкар павінен бачыць эфектыўнасць работы з рознымі катэгорыямі чытачоў. Толькі тады ён будзе ведаць, якая літаратура знайшла дарогу да сэрца даслага або дзіцяці, якая кніга патрабуе асобай прапаганды, рэкамендацыі. І тыя нядоўгія мінуты, затрачаныя на абслугоўванне дзяцей, не прападуць дарэмна: прачытанае ў дзяцінстве запомніцца надоўга, выхаваныя навыкі карыстання кнігай спатрэбяцца і тады, калі дзеці стануць дарослымі. Такі ўлік заведзены ў многіх бібліятэках. Напрыклад, чытачамі Сялюцкай сельскай бібліятэкі Віцебскага раёна з'яўляюцца ўсе вучні мясцовай васьмігодкі, за выключэннем першакласнікаў. Такія чытачы ёсць і ў Рудакоўскай сельскай бібліятэцы, Рубаўскім сельскім клубе гэтага раёна і ў многіх іншых культасветустановах.

Пры абмеркаванні пытання аб бюджэце часу бібліятэкара неабходна звярнуць увагу і на арганізацыю рабочага дня, падрыхтоўку да выдачы кніг і асабліва на правільнае планаванне работы з улікам магчымасцей, кантынгенту чытачоў, гаспадарчых асаблівасцей калгаса або саўгаса, на тэрыторыі якога размешчана бібліятэка.

Пытанне аб бюджэце часу бібліятэчнага работніка вельмі важнае. І добра было б, каб на гэтым не скончылася гутарка. Хочацца пачуць ад сваіх калег па працы расказ і пра іхні вопыт выкарыстання рабочага часу.

М. ЖЫХАР,
загадчык метадычнага аддзела Віцебскай абласной дзіцячай бібліятэкі імя Крупскай.



Прыгожы тунель злучае Прывакзальную плошчу з перонамі Мінскага вакзала. Ёй аздоблены ўстаўкамі з керамічнай мазаікі на аблiцоўчай плітцы, выкананымі мастакамі Ф. Зільбертам, В. Гаўрылавым, Я. Цвінгелем.

Чэрвеньскі экран

«Таёжны дэсант» — так называецца новая шыроканэкранная мастацкая кінааповесць, створаная рэжысёрам Уладзімірам Краснапольскім і Валерыем Усковым на кінастудыі «Масфільм» па матывах рамана Уладзіміра Арлова «Салёны кавун».

У ролі Буквара здымаўся ваеннаслужачы Станіслаў Бародкін. У астатніх ролях заняты Уладзімір Гусеў, Віктар Задуброўсні, Ірына Вавілава, Антаніна Жмакава, Валянціна Целечкіна і інш.

Гледачы ўбачаць новую двухсерыйную шыроказкранную мастацкую кінакарціну «Дзень добры, гэта я!» вытворчасці кінастудыі «Арменфільм». Аўтар сцэнарыя Арнольд Агабабаў, рэжысёр-пастаноўшчык — Фрунзе Даўлацян.

Гэты фільм нібы працягвае лінію так званага інтэлектуальнага кіно, лінію «Дзевяці дзён аднаго года» Міхаіла Рома. Рамкі карціны па часе шырокія — ад 1942 года да нашых дзён. Яе героі — не проста маладыя вучоныя-фізікі, людзі, якія прайшлі вайну і ведаюць сапраўдную цану міру. Гэта людзі, якія знаходзяцца ў пастаянным пошуку і, нягледзячы на горыч страт і расчараванняў, захоўваюць аптымізм, веру ў сябе.

— Мы шмат думалі, як перадаць на экране дынаміку думкі, а не сюжэта, вялізарны інтэлектуальны багаж нашага героя — даследчыка касмічных прамененняў Арцёма, комплекс яго адчуванняў, успрыняццяў пры вельмі скупым, стрыманым воннавым абліччы, — расказвае Ф. Даўлацян. — Мы ўзялі на гэтую ролю акцёра Армэна Джыгарханяна з Ерэванскага драматычнага тэатра імя Станіслаўскага. Мне здаецца, яму ўдалося галоўнае ў характары Арцёма — шчырасць эмоцый, вялікая чалавечая прывабнасць.

У фільме здымаліся таксама Наталля Фацеева, Ралан Быкаў, Маргарыта Церахава і інш.

Кожнага, хто перагортвае залатую кнігу рэвалюцыйнай гісторыі латышскага народа, хто знаёміцца з летапісам яго барацьбы за Савецкую ўладу, прыцягне і захопіць старонка, прысвечаная подзвігу каманды «Герцага Екаба». Гэтае судна апынулася ў аніяне, калі быў скінуты фашысцкі рэжым Ульманіса, калі ў Латвіі зноў перамаглі Саветы.

— Вярнуцца! Як бы там ні было, вярнуцца на абноўленую Радзіму! — вырашыла каманда карабля.

Наступілі 127 дзён мужнасці і нягод, адвагі і стойкасці, але горды калектыў маракоў здзейсніў свой намер. Амерыканскія палітыканы, якія спрабавалі купіць або запалохаць маракоў, збянтэжыліся: яны сутыкнуліся з непахіснай воляй да свабоды, да чалавечай годнасці.

Новы шыроказкранны мастацкі фільм «Табага» мяняе курс», пастаўлены рэжысёрам Аляксандрам Лейманісам на Рыжскай кінастудыі па сцэнарыі М. Блейманa, Г. Цыруліса і А. Імерманіса, бясспрэчна, навеяны гісторыяй «Герцага Екаба», хоць тут і няма дакладнага ўзнаўлення падзей, няма адважнага капітана Мікельсана, няма здрадніка Грыныня, няма і самога паланення карабля ў адным з амерыканскіх портаў.

На экране іншыя героі і іншыя сітуацыі. Але атмасфера подзвігу ў акіяне, здзейсненага за тысячы міль ад родных берагоў, бясспрэчна, захапіла аўтараў карціны. І яны расказалі пра вострыя і непрымірымы канфлікт паміж сумленнасцю і дварушнасцю, паміж самаадданасцю барацьбітоў рэвалюцыі і шкурніцтвам здраднікаў са зграі нацыяналістычнай буржуазіі, у якой няма іншага шляху, чым прыслужніцтва фашызму.

Новая каляровая музычная кінакамедыя «Кухарка» створана рэжысёрам Эрмандам Кеасянам на кінастудыі «Масфільм» па матывах аднайменнай п'есы Анатоля Сафронава.

У фільме заняты папулярныя кінаакцёры Людміла Хіцяева, Георгій Юматаў, Святлана Святлічная, Іван Саўкін, Канстанцін Сарокін, Сяргей Філіпаў, Зоя Фёдарава, Павел Шпрынгфельд і інш.

У чэрвені на экраны рэспублікі выпускаюцца таксама новая грузінская кінакарціна «Летняя апавяданні» і туркменскі мастацкі фільм «Певень».

Для самых юных гледачоў будзе дэманстравацца новая каляровая шыроказкранная мастацкая кінааповесць «Аквалангі на дне», створаная рэжысёрам Яўгеніем Шарстабітавым на Кіеўскай кінастудыі імя А. П Даўжэнкі па ўласным сцэнарыі.

З зарубежных кінастужак гледачы змогуць убачыць: балгарскую — «Трынаццаць дзён»; чэхаславацкую — «Калі б тысяча кларнетаў»; кубінскую — «Жызель»; югаслаўскую — «Службовае становішча»; мексіканскую — «Пісьмы Расаліі»; францка-італьянскую — «Спакушаная і пакінутая»; фільм вытворчасці кінастудыі «ДЭФА» (ГДР) — «Дзяўчына з джунгляў», а таксама кінакарціну ФРГ — «Ордэны для вундэркіндаў» і двухсерыйны фільм «Хаціна дзядзі Тома», створаны сумесна кінематаграфістамі Італіі, ФРГ і Югаславіі.

Кадр з фільма «Табага» мяняе курс».

Кадр з фільма «Дзень добры, гэта я!».

КОНКУРС ПРАЦЯГНУТЫ

Міністэрства культуры БССР паведамляе, што конкурс на лепшую многаактовую п'есу, прысвечаную 50-годдзю Савецкай улады, працягнуты да 1 снежня 1966 года.

ЧАСОПІСЫ Ў ЧЭРВЕНІ

«НЕМАН» № 6

У артыкуле, прысвечаным 25-годдзю з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны, П. З. Калінін расказвае аб узаемасувязі баявых дзеянняў беларускіх партызан і часцей Савецкай Арміі.

Часопіс працягвае друкаваць партрэты і кароткія біяграфічныя даведкі Герояў Савецкага Саюза — нашых землякоў.

У перакладзе з беларускай мовы змешчаны апавяданні Алены Васілевіч аб цяжкой ваеннай зіме 1941-42 гадоў.

Працоўныя будні радкацыі абласной газеты — тэма аповесці Валерыя Перуанскай «Чатыры паласы».

З шостага нумара часопіс пачынае друкаваць у перакладзе на рускую мову дэтэктыўную аповесць «Ключ следства» Збігнева Стэфана — вядомага польскага пісьменніка і кінасцэнарыста.

Паэзія ў «Немане» прадстаўлена вершамі маладых паэтаў Леаніда Дайнекі і Эдуарда Скобелева.

Думаецца, выкліча цікавасць публікацыя паэмы «Тарас на Парнасе» ў перакладзе на рускую мову Міхаіла Ісакоўскага з прадмовай Яўг. Мазалькова. Завяршае публікацыю артыкул Міколы Маляўні «Калі была напісана паэма «Тарас на Парнасе»?», у якой аўтар выказвае свае меркаванні наконт часу стварэння паэмы.

Аб рабочых-будаўніках, таварышах па поацы, усхвалявана расказвае інжынер Уладзімір Кудзінаў у нарысе «Падзеленая радасць».

Траці разявел нарыса Якава Драбінскага пра Міколу Дворнікава, хлопца з Гомеля, які стаў вядомым партыйным дзеячом КПЗБ, называецца «Стах Тамашэвіч». Пад гэтым імем Дворнікаў змагаўся і загінуў у баях за рэспубліканскую Іспанію.

Пад рубрыкай «Знойдзена ў архівах» паведамляецца аб невядомых аўтографах І. С. Тургенева, выяўленых ў ЦДГА БССР, і аб арышце ў 1875 годзе брашуры «Будова свету. З метамарфоз Авідзія Назона», выдадзенай у Бабруйску.

Часопіс надрукаваў рэцэнзію Я. Міско на зборнік «Сцягі і паходні» і рэцэнзію А. Сурскага на кнігі «Свет працы — свет прыгажосці» І. Галкіна і «Аб эстэтыцы вытворчасці» С. Ваўчкова.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

3 чэрвеня

Першая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 17.30—рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Надзейныя памочнікі». Пра комплексную механізацыю свінагадоўчых ферм. 18.00—тэлевізійныя навіны. 18.20—«Спявае Роза Багланава». Фільм-канцэрт. 18.45—«Кузня кадраў». Выступленне рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна А. Н. Сеўчанкі. 19.00—тэлевізійны тэатр мініяцюр. І. Ільф і Я. Пятроў. «Трынаццатае крэсла» (М). 20.00 — «Эстафета навін» (М). 21.00—на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага. Дзённік (М). 21.30—рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. Выступленне міністра аўтамабільнага транспарту БССР А. Н. Андрэева. 21.50—па вашых просьбах. «Вялікае жыццё». Мастацкі фільм. Першая серыя.

Другая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 11.45—рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Гутаркі пра самае важнае» (М). 17.30—*тэлевізійныя навіны* (М). 17.50—«Скарбы побач з намі». Перадача з Ленінграда. 18.20—народныя азербайджанскія музычныя інструменты (М). 18.50—насустрач выбарам у Вярхоўны Савет СССР. «Нашы кандыдаты» (М). 19.00—рэклама, аб'явы. 19.10—С. Маршак. «Разумныя рэчы». Тэлевізійны спектакль. 21.30—у эфіры—«Маладосць». «Арбіта» (М).

4 чэрвеня

Першая праграма. 15.30—праграма перадач. 15.35—дзіцячы экран. «Старонкі календара». «Чые ў лесе шышкі?» Мультыплікацыйныя фільмы. 16.00—насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Дваццаць год у страі». Праграма прысвячаецца Мінскаму трактарнаму заводу. 18.00—клуб кінападарожнікаў (М). 19.00—«На агеньчыку» (М). 20.00—тэлевізійныя навіны (М). 20.20—па вашых просьбах. «Вялікае жыццё». Мастацкі фільм. Другая серыя. 22.05—эстрадны агляд. Перадача з Варшавы.

Другая праграма. 16.00—для школьнікаў. «Кнігі пра юнага Маркса» (М). 16.30—канцэрт малдаўскай народнай музыкі. Перадача з Кішынёва. 17.10—тэлевізійныя навіны. (М). 17.30—да 50-годдзя Савецкай улады. «Запіскі камісара». Перадача з Казані. 18.00—канцэрт мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 20-годдзю Мінскага трактарнага завода.

5 чэрвеня

Першая праграма. 8.25—у дапамогу завочнікам. 1. «Дадаткі вытворнай». Чытае загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі БПІ кандыдат фізіка-матэматычных навук Н. В. Папова. 2. Лекцыю па асновах парашковай металургіі чытае загадчык кафедры тэхналогіі металаў БПІ кандыдат тэхнічных навук А. У. Гаман. 9.55—праграма перадач. 10.00—для дзяцей. «Варанкін, будзь чалавекам». Мультыплікацыйны фільм (М). 10.30—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 11.00—на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 11.30—Ленінград. «Удалечыні ад шумных плошчаў». Гісторыка-архітэктурны нарыс. Перадача з Ленінграда. 12.00—для дзяцей. «У пошуках песні». Перадача з Прагі. 12.45—школа ігры на баяне (урок 13-ы). 13.40—канцэрт па заяўках трактараводаў. 14.20—для дзяцей. І. Юргілевіч. «Восем лялек і мядзведзік». Спектакль дзіцячай драматычнай студыі Беларускага тэлебачання. Трансляцыя на Маскву. 15.40—«Музычны кіёск» (М). 16.00—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту (М). 16.30—музычная шкатулка. 16.50 «Лясная быль». Кінанарыс. 17.10—тэлевізійныя навіны (М). 17.20—«Эстрада-66» (М). 18.00—«Пеленгатар» (М). 18.30—міжнародная сустрэча па футболу. СССР—Францыя. Перадача з Лужнікоў. У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 20.30—«Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 21.00—«Верны робат». Тэлевізійны спектакль. 22.30—«Вясёлая вікторына» (М).

Другая праграма. 16.30 — «Купальскія гульні». Канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці. Перадача з г. Львова. 17.10—для школьнікаў. «Планета бур». Мастацкі фільм. 18.40—выступаюць удзельнікі Фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР і УзССР. Майстры мастацкага слова М. Зорын і О. Спіткоўская. 19.15—«Бывайце здаровы». Праграма Беларускага дзяржаўнага цырка. Кінафільм. 21.00—«Лайце кнігу скаргаў». Мастацкі фільм (М).

МУЗЕЙ НАРОДНАГА МАСТАКА

У Бялынічах ствараецца музей народнага мастака РСФСР і БССР Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі. Тут ужо сабрана 23 творы майстра. Сярод карцін—пейзажы «Красавік», «Непагадзь», «Зацвіла лотаць» і іншыя.

Р. ЯЎСЕЕЎ.



НА ТРЭНІРОЎЦЫ. Фота В. ХВАЙНІЦКАГА.

Куток калекцыянера

У ГОНАР МУЗЫКІ

«III Міжнародны конкурс імя П. І. Чайкоўскага»—такі чырвоны надпіс, трошкі стылізаваны пад стараславянскі шрыфт, дадзены на марках серыі, прысвечанай выдатнай музычнай падзеі 1966 года.

Аўтар серыі—мастак-гравёр Анатоль Калашнікаў. Выкананы ім партрэт Чайкоўскага неаднаразова ўзнаўляўся на вокладках нот, а потым быў выкарыстаны для буклета да II Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага і на пераплёце кнігі «Успаміны пра П. І. Чайкоўскага» (Муздзаржвыдавецтва, 1962). Можна ўбачыць гэты партрэт на буклетах і афішах, прысвечаных трэцяму конкурсу. Цікава, што пры ўручэнні дыпломаў пераможцам II конкурсу імя Чайкоўскага ім дарыліся і аўтарскія адбіткі з партрэта Чайкоўскага з аўтографамі мастака Калашнікава.

На фоне разгорнутага нотнага сшытка гэты партрэт узноўлены і на шасцікапеечнай марцы новай серыі. Выкананa яна штыхілем па дрэву і з'яўляецца своеасаблівым унікумам па тоннасці разьбы. Пераважаючыя колеры: чырвоны, палевы і чорны.

На марцы з наміналам чатыры капейкі ўзноўлены будынак Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, якая носіць імя геніяльнага кампазітара. Перад будынкам—помнік Чайкоўскаму. Марка выкананa ў той жа колернай гаме, што і шасцікапеечная.

Дом-музей П. І. Чайкоўскага ў падмаскоўным горадзе Кліне адлюстраваны на трэцяй марцы серыі коштам 16 капеек. Углядаешся ў малюнак і здаецца, што дамок ахутаў блакітны змрок, на даху іскрыцца снег, а побач стаяць заснежаныя бярозы. Выкананa марка ў спалучэнні светла-блакітнага, чорнага і чырвонага колераў.

Кожны з малюнкаў—гэта мініяцюрная разьба па дрэву ў натуральную велічыню маркі. Друк высокі на мелаваным паперы. Зубцоўка лінейная. Памеры жывапісных палёў—32 на 32 міліметры.

У дні конкурсу Міністэрства сувязі СССР арганізавала гашэнне знакаў паштовай аплаты спецыяльным штэмпелем. Яго малюнак своеасаблівы. На фоне сеткі зямнога шара—нотная лінейка са скрыпічным ключом. У гэтую лінейку ўпісаны тэкст: «III Міжнародны конкурс імя П. І. Чайкоўскага». А ўнізе паказаны месца і час гашэння: Масква. К-9. 30.V.—29.VI. 1966».

АДН.

ДАКАРСКІ ФЕСТЫВАЛЬ

З 30 сакавіка па 26 красавіка ў Дакары — сталіцы Рэспублікі Сенегал — праходзіў першы Сусветны фестываль афра-негрыцянскага мастацтва. У гэтым буйнейшым у гісторыі Чорнага кантыненту сваіх культуры прынялі ўдзел дзеячы культуры, мастацтва і навукі, цэлыя тэатральныя калектывы з 30 афрыканскіх дзяржаў і краін іншых кантынентаў, якія маюць значнае негрыцянскае насельніцтва, — ЗША, Бразіліі, Трынідада і Табага і інш.

Ніжэй публікуецца артыкул, які расказвае пра гэты фестываль.

Час нібы спыніў свой бег на Гарэ. Малюсенькі востраў — асколак базальту, кінуты прыродаю ў Атлантычным акіяне, у васьмі кіламетрах ад Дакара, ён у першародный недатыкальнасці захаваў сваё сярэдневяковае аблічча. Грозныя ўмацаванні форта — памяць пра тыя часіны, калі ў XVI—XVIII стагоддзях Гарэ быў цэнтрам гандлю рабамі ўсяго Гвінейскага ўзбярэжжа. Асабнякі «гаспадароў» вострава — датчан і галандцаў, англічан і французаў, якія з калейдаскапічнай хуткасцю змянялі адзін аднаго, імпазантны палац губернатара, ля ўваходу ў які плешчуцца воды Атлантычнага акіяна... Праз лабірынты вузенькіх вуліц, дзе кіпіць сучаснае жыццё, гасцінныя сенегальскія гаспадары правялі нас у руіны падземных казематаў, адкуль звезеных з усёй Афрыкі рабоў упіхвалі проста на галеры, што ішлі ў Бразілію, Паўночную Амерыку, Вест-Індыю...

Так выглядае Гарэ ўдзень. Калі ж востраў ахутваў аксаміт афрыканскай ночы, яго вуліцы і плошчы пачынаялі жыць іншым жыццём. Жвавыя кацеры пераводзілі з Дакара на Гарэ сотні гасцей — сенегальцаў і турыстаў, што з'ехаліся на першы Сусветны фестываль афра-негрыцянскага мастацтва. Тут кожны вечар даваўся адзін з асноўных паказаў фестывальнай праграмы — феерычны спектакль «Святло і гук». У натуральных умовах дэкарацыямі да спектакля служылі ўцалелыя пабудовы вострава, артысты былі адабраны з мясцовых жыхароў — нашчадкаў рабоў — гэты спектакль узнаўляў 400-гадовую гісторыю Гарэ. Змрочны перыяд гандлю рабамі, хваробы і галеча эпохі каланіялізму, жорсткасці захопнікаў, гераічная нацыянальна-вызваленчая барацьба — вось асноўныя вехі спектакля.

Праўда, многія ў Дакары не ўтойвалі, што ў сваёй першай рэдакцыі сцэнарый «Святла і гуку» меў яшчэ больш антыкаланіялістычных напрамак і балюча біў учарашніх «гаспадароў» Сенегала. І толькі націск з боку французскага пасольства і ўмяшанне сяго-таго з сенегальскай кіруючай вярхушкі прымусілі аўтараў феерыі — гаіцяніна Жана Брэйера ўбавіць палітычны напал спектакля.

Сёй-той у Афрыцы, ужо не гаворачы пра розныя заходнія ідэалагічныя арганізацыі, якія прымалі ўдзел у арганізацыі фестывалю, спрабаваў ператварыць гэтую важнейшую падзею ў культурным жыцці кантыненту ў апалітычны агляд рытуальных танцаў і старажытных абрадаў масак. Што ж датычыць арганізацыі гэтага дорага каштуючага мерапрыемства, дык Сенегал, відаць, зусім не выпадкова ўзяў на сябе ўсе звязаныя з ім цяжкасці.

Заняпад эканамічнага і палітычнага ўпадыву Дакара, які яшчэ пяцьдзесят гадоў назад быў галоўным цэнтрам велізарнай каланіяльнай імперыі — Французскай Заходняй Афрыкі, лідэры Сенегала ў апошні час імкнуцца папоўніць у галіне ідэалагічнай. Прэзідэнт Сенегала Леапольд-Седар Сенгор — прызнаны паэт і самабытны філосаф — вядомы як заснавальнік даволі папулярнай у сённяшняй Афрыцы філасофскай тэорыі «негрыцюда». Гэта канцэпцыя, якая ўзнікла яшчэ ў 30-х гадах, «была эмацыянальнай (калі не лагічнай) антытэзай той знявазе, якую белы чалавек наносіў чалавечнасці», — піша вядомы афрыканскі вучоны і сацыёлаг Франц Фанон.

У «негрыцюдзе» ёсць шмат спрэчных палажэнняў. Так, нельга пагадзіцца з выказваннямі, якія з'явіліся ў фестывальныя дні ў прэсе Сенегала, пра быццам бы «асаблівую, не пазнавальную для еўрапейца душу неграў», з думкамі пра «спрадвечную непрыязнасць» афрыканца да навукова-тэхнічнага прагрэсу і няздольнасць да класавай барацьбы, пра тое, што будучыня Афрыкі — у кансервацыі архаічных і рэакцыйных форм традыцыйнага побыту. У той жа час у сучасным «негрыцюдзе» ёсць і рацыянальнае зерне. Яго прыхільнікі выступаюць за «культурную раўнапраўнасць» Чорнага кантыненту, імкнуцца паказаць той уплыў, які Афрыка зрабіла на іншыя сусветныя цывілізацыі. І ў гэтым сцвярджэнні і прапагандзе велічы афрыканскай культуры — галоўнае значэнне фестывалю ў Дакары.

А ў тым, што пра афрыканскую культуру ведаюць ганебна мала, я пераканаўся яшчэ да прыезду ў сенегальскую сталіцу.

— Афрыканскае мастацтва, а ці ёсць такое? — не то са здзіўленнем, не то іранічна спытаў мяне ў касабланцкім порце мажны самавіты англічанін, пачуўшы, што я еду на дакарскі фестываль. — Ці варта ехаць у такую далеч, ды яшчэ ў трапічнае пекла, каб убачыць прымітыўныя скоп'і ля вогнішча ды страшныя маскі, якія за некалькі пенсаў можна купіць на любым лонданскім скрыжаванні...

Я не спрачаўся з самаўпэўненым брытанцам. Бадай, ён не быў нават вінаваты ў сваім невуцтве. Выконваючы сацыяльны заказ імперыялізму, заходнія вучоныя на працягу стагоддзяў імкнуліся «апраўдаць» каланіяльныя захопы ў Афрыцы «перавагаю» белых і «непаўнацэннасцю» чорных. Іменна для гэтай мэты заходняя фокуснікі ад пяра сцвярджалі, што ўсё вялікае, усё прагрэсіўнае, што створана чалавечай культурай, належыць белым, што насельніцтва Афрыкі па прыродзе сваёй збеднена, пазбаўлена ініцыятывы і таму не ўнесла ўклад у скарбніцу сусветнай цывілізацыі. Любое праяўленне прагрэсу ў неграў тлумачылася ўплывам еўрапейцаў або, прынамсі, азіятаў. У буржуазнай афрыканістыцы і па сённяшні дзень вельмі папулярная так званая хамітская тэорыя, поўнасцю адхіленая савецкімі вучонымі. Аўтары гэтай «тэорыі» даказваюць, што ўсімі сваімі дасягненнямі афрыканцы абавязаны хамітам — выхадцам з Азіі, своеасаблівым афрыканскім арыйцам, якія заваявалі Афрыку, навязалі яе насельніцтву сваю высокую культуру, заснавалі дзяржаву.

Адной з ахвяр гэтай тэорыі стала, у прыватнасці, бенінская бронза. Калі ў 1897 годзе англійскія каланіяльныя войскі, злямаўшы ўпартае супраціўленне невялікага заходнеафрыканскага народа эве, захапілі яго сталіцу — Бенін, дык сярод руін каралеўскага палаца знайшлі некалькі вырабаў з бронзы. Хутка ўзоры скульптуры з Беніна праз скупшчыкаў трапілі на вітрыны музеяў і антыквараў Лондана і Парыжа, дзе зрабілі сапраўдны фурор. Рэалізм і тонкасць выканання, пластычнасць, якая спалучаецца са здзіўляючай строгасцю і прастатой, — усё гэта гаварыла пра тое, што аўтары гэтых цудоўных твораў маюць шматвяковыя традыцыі і вопыт. «Лінія губ, форма вушэй, абрысы твару — усё гэта, што разглядаецца разам і паасобку, сведчыць пра дасканаласць твораў сапраўднага мастацтва, якім яно, бясспрэчна, з'яўляецца», — пісаў нядаўна пра творы бенінскіх майстроў нямецкі вучоны Фрабеніус.

Рэакцыйныя вучоныя Еўропы, якія не жадалі прымірыцца з думкаю, што афрыканскія народы могуць быць творцамі такога дасканалага мастацтва, тлумачылі паходжанне бенінскай бронзы то грэчаскім уплывам, то прыпісвалі яе міфічным «хамітам». І толькі праз шмат гадоў прагрэсіўным вучоным удалося даказаць, што культура Беніна — культура сапраўды афрыканская, якая зараздзілася на тэрыторыі сучаснай Нігерыі яшчэ ў XIV стагоддзі. Цяпер вучоныя ўсяго свету ставяць вырабы бенінскіх умельцаў у адзін рад з творамі скульптараў Элады і Рыма. У прасторных, трошкі таямнічых залах дакарскага музея «Дынамік», дзе размясцілася выстаўка традыцыйнага мастацтва Афрыкі, я ўбачыў бенінскія шэдэўры, знаёмыя раней толькі па рэпрадукцыях у энцыклапедыі. Упершыню пасля разрабавання Беніна яны былі звезены ў Афрыку з музеяў Лондана і Парыжа, Амстэрдама і Бруселя.

А побач з бронзаю Беніна — неапісальная разнастайнасць скульптуры драўлянай, масак, тэракоты, вышыўкі, пляценні, чаканкі, разьба па слановай косці — узоры нацыянальнага мастацтва амаль усіх афрыканскіх краін. І на ўсіх гэтых вырабах — адбітак творчага генія народа, непаўторнасць стыляў і форм. У трапічных лясах Конга і суровых пясках Сахары, стагоддзямі адарваных ад свету, невядомыя афрыканскія мастакі ішлі сваімі ўласнымі шляхамі, але прыходзілі да адзіных вынікаў: іх мастацтва глыбока народнае, гуманнае, праўдзівае.

Не меншае ўражанне рабіла і выстаўка сучаснага мастацтва, якая размясцілася ў вялікім мадэрнісцкім будынку «Палаца правасуддзя». Галоўнае тут — адмаўленне ад традыцыйнага, рэлігійнага напрамку ў мастацтве, з'яўленне ў творчасці афрыканскіх мастакоў сацыяльных тэм, пафас барацьбы за незалежнасць, за новае жыццё.

А пасля таго як госці Дакара пакідалі прасторныя залы фестывальных выставак, іх захапляла стыхія народнай музыкі і танца. Здавалася, што ў фестывальныя дні танцаваў увесь горад: і яго жыхары, падбадзёраны